This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Katedra Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2024.pp.9-49

Przegląd Środkowo-Wschodni, 9, 2024
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20240901

Data przesłania: 19.04.2024
Data akceptacji: 27.06.2024

**Віктар Якубаў**

Wydział Artes liberales, Warszawski Uniwersytet
yakubau@yahoo.com
ORCID: 0000-0002-5239-1598

# Удзел грамадзян ВКЛ ў войску II Ілжэдзмітрыя ў 1608–1610 гг.

**Udział obywateli WKL w wojsku Dymitra Samozwańca II w latach 1608–1610**

Głównym celem artykułu jest odnalezienie i uwypuklenie udziału przedstawicieli Wielkiego Księstwa Litewskiego w ruchu Dymitra Samozwańca II podczas rosyjskiej „Wielkiej Smuty". Autor podjął próbę udowodnienia udziału przedstawicieli ziem białoruskich WKL w armii najemnej Dymitra Samozwańca II i istnienia odrębnego dowództwa składającego się z przedstawicieli ukraińskiej magnaterii Korony Polskiej, która dowodziła w obozie Samozwańca w Tuszynie. Dymitr Samozwaniec I i Dymitr Samozwaniec II zostali oficjalnie zignorowani przez elity rządzące WKL, a król Zygmunt Waza zabronił obywatelom i szlachcie udziału w atakach na Moskwian. Początkowo do Samozwańców dołączyła powiatowa szlachta kresowa – J. Budzilla, J. Kernażycki, M. Wilamowski i zbóje A. Lisowskiego, a dopiero po zakończeniu rokoszu w WKL, latem 1608 r. dowódcami pułków zostali kapitanowie weterani armii Wielkiego Księstwa Litewskiego: J.P. Sapieha, J. Tyszkewicz, A. Mlocky, E. Strawiński i inni. W przeciwieństwie do ziem ukraińskich Królestwa Polskiego, magnateria WKL, z wyjątkiem Tyszkiewiczów, nie poparła Dymitra Samozwańca. Obecnie brakuje dowodów na to, jaki stosunek do tego miał król Zygmunt Waza. Wiadomo, iż J.P. Sapieha został hetmanem północnej groty armii Dymitra Samozwańca II. On i jego kapitanowie pochodzący z WKL wykonywali najważniejsze zadania bojowe w latach 1609–1610, okupując północ Rosji próbowali uniemożliwić przemarsz M. Skopina Szujskego i Szwedów na Moskwę jesienią 1609 r. Po rozpoczęciu wojny między Rosją a Rzecząpospolitą 1609–1618, ucieczce Dymitra Samozwańca II

i przysiędze złożonej przez bojarów moskiewskich na wierność księciu Władysławowi, najemnicy z WKL, z własnej woli, wstąpili do armii państwowej.
Słowa kluczowe: Wielkie Księstwo Litewskie, Dymitr Samozwaniec II, wojska najemne, magnaci ochotnicy

Адной з закрытых тэмаў для афіцыйнай гістарычнай навукі Беларусі да гэтага часу з'яўляецца ўдзел і роля прадстаўнікоў беларускіх земляў ВКЛ у руху Самазванцаў ў Маскоўскай дзяржаве 1606–1611 г. Для расійскай і польскай гістарыяграфіі і грамадскай думкі XIX–XX ст. пры разглядзе падзей Расійскай Смуты было абсалютна характэрна ігнараваць удзел іх продкаў сучасных беларусаў і ўкраінцаў. Сённяшнія дыктатарскія рэжымы Расіі і Беларусі, нават больш чым пры цары, палітызавалі гэтую тэму, робячы з яе ідэалагічнае абгрунтаванне міжцывілізацыйнага супрацьстаяння. Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца выяўленне „грамадзян" ВКЛ і іх ролі сярод удзельнікаў Ілжэдзмітрыяды 1606–1610 г.

Першага Ілжэдзмітрыя, ані магнатэрыя, ані дзяржаўныя структуры ВКЛ у адрозненні ад казакоў і шляхты (Мнішкі, Вішнявецкія) польскіх і ўкраінскіх земляў Польскага каралеўства (Кароны) не падтрымала[1]. Адзіная вядомая павятовая інструкцыя ВКЛ 1604 г. - слонімскага сойміка, прызнала "царэвіча", але заклікала трымаць мір з Масквой[2]. Аднак, калі Самазванец стаў царом Дзмітрыем I (1605–1606), а сандамірскі ваявода Юры і Марына Мнішак паехалі да яго ў Маскву, сенатары ВКЛ пачалі дамаўляцца з пераможцамі. Тым больш, што шлях вясельнага аршака праходзіў праз Берасце, Слонім, Менск і Оршу. У Слоніме, ім і іх світе ў 1969 чалавек, на чале з кароннымі магнатамі Вішнявецкімі, Тарло, Стадніцкімі на Вялікдзень 1606 г. вялікі канцлер ВКЛ Леў Сапега зладзіў баль. 31

[1] А.В. Дземідовіч, *Вялікае Княства Літоўскае ў адносінахРэчы Паспалітай з Расіей і Швецыяй у першай трэці XVII ст.*, Мінск 2021, с. 44–55.

[2] Амброзяк Т., *Отношение литовских сеймиков к Смуте и интервенции Речи Посполитой в Москве* [w:] *Смута как исторический и социокультурный феномен.* Материалы всеросийской научной конференции 22.04.2013, Москва, 2013 с.181–182.

сакавіка ў Нясвіжы, з будучай царыцай і яе бацькам віленскі ваявода Мікалай Радзівіл правёў прыватныя перамовы[3]. Рэчы Паспалітай неабходна было пацвердзіць мір з Масквой пры новым цары, таму на вяселле Дзмітрыя І з Марынай Мнішак была выпраўлена вялікае пасольства на чале з веліжскім старастам Аляксандрам Гасеўскім[4] і малгоскім кашталянам Мікалаем Алясніцкім[5]. Шлюбныя ўрачыстасці скончыліся трагедыяй 27 траўня 1606 г. Змоўшчыкі справакавалі пагром супраць замежнікаў, пад час якога забілі цара. Тых з гасцей хто выжыў, кінулі ў маскоўскія турмы, уключна з вялікімі пасламі і Мнішкамі. Забойцы цара Дзмітра І, начале з новым царом Васілем Шуйскім (1606–1610), афіцыйна тлумачылі масквічам, што той збіраўся разам з „літвой" замяніць праваслаўе на каталіцтва, а баяр і дваран – на магнатаў і шляхту. Гвалт над пасламі быў абразай дзяржавы і мог стаць законнай прычынай для пачатку вайны[6].

Аб падзеях у Маскве ў ВКЛ стала вядома ўжо ў канцы траўня 1606 г. Адразу пасля забойства, па Расіі пачаўся рух новых Самазванцаў і казацтва. Выведка ВКЛ вымушана была кантактаваць з імі. Летам 1606 г. Міхаіл Малчанаў абвесціў у Самборы пры двары Ежы Мнішака сябе „царом Дзмітром" і натхніў Івана Балотнікава на паўстанне. Аднак, як і ў выпадку першага Самазванца, сенат ВКЛ блакаваў на дзяржаўным узроўні ідэю інтэрвенцыі на Усход. Як толькі самазваны „цар" паспрабаваў параслаць у Пуціўль праз землі ВКЛ, атрад наймітаў на падтрымку балотнікаўцаў, людзі Л. Сапегі перахапілі „гетмана" і яго салдат. Вялікі канцлер ВКЛ, як каардынатар дыпламатыі і выведкі на Усходзе, даслаў у каронны

---

[3] Dyaryusz Waclawa Dyamentowskiego (1605–1609) [w:] A. Hirschberg, *Polska a Moskwa w pierwszej połowie weku XVII*, Lwów 1901, s. 24–26.

[4] Сын ротмістра паляка, літвін у другім пакаленні, пачаткова слуга Л. Сапегі. Меў грамадства і маёмасць у Віцебску і Вільні. Niesiecki K., *Herbarz polski: w X t.,* t. IV, Lipsk 1839, c. 221.

[5] A.G. Przepiórka, *Od Staroduba do Moskwy. Działania wojsk Dymitra II Samozwańca 1607–1608*, Zabrze 2007, s. 19.

[6] Biblioteka Naukowa Polskiej Akademii Nauk i Polskiej Akademii Umiejętności (BN PAN PAU w Krakowie), sygn. 363, №23.

Самбор свайго слугу (Яна) Грыдзіча, каб „дазіраць" самазванца, але той уцек ад прымусовага нагляду „каяцца" ў кляштар бернардынаў. Рашучыя дзеянні канцылярыі ВКЛ паспрыялі таму, каб М. Малчанаў знік з далягладу і з'явіўся толькі праз паўгады ў свіце новага Самазванца, які аб'явіўся ўжо ў ВКЛ.

6 снежня 1606 г. іншы самазванец, які абвесціў сябе ўнукам Івана IV Жахлівага – Ілжэпётр, аб'явіўся ў Копысі дзеля таго, каб сустрэць „дзядзю". Яго пад кантролем паноў Зяновіча і Сянькевіча даставілі на сустрэчу з аршанскім старастам, мсціслаўскім ваяводам Андрэем Сапегам. У сувязі з візітам Ілжэпятра ў Віцебску 8 студзеня 1607 г. упершыню ўзгадваецца „цудам выратаваны цар Дзмітры". Верагодней за ўсё, гэта быў валацуга – настаўнік з ваколіц Шклова – Іван Нагі. Нягледзячы на некалькі стагоддзяў прафесійных гісторычных даследаванняў, дакументальна даказаць яго сувязь ці інспірацыю спецслужбамі ВКЛ дагэтуль няўдалося. Наадварот, канцлер і сенатары ВКЛ выступалі супраць авантуры і дзейсна супрацьдзейнічалі ёй. Паводле афіцыйнай версіі віцебскі „Дзмітры", неўзабаве „спужаўся" і ўцек у Прапойск, дзе яго схапілі і кінулі ў турму людзі чачэрскага, прапойскага старасты і берасцейскага ваяводы Крыштофа Зяновіча, а Ілжэпятра дэпартавалі назад з тэрыторыі ВКЛ у Маскоўскае царства[7].

Галоўнай прычынай зацягвання рэакцыі на знявагу пасольства была вайна са Швецыяй у Інфлянтах 1600–1611 г. і рокаш 1606–1609 г. Пад ціскам гэтых праблем Жыгімонт Ваза, як вялікі князь ВКЛ афіцыйна забараняў беларускім мяшчанам нападаць на маскоўскіх купцоў па абодва бакі мяжы ў 1604–1608 г[8]. Тым не меньш у канцы 1606 г. манарх паспрабаваў аб'яднаць грамадства, прапанаваўшы ў інструкцыях на павятовыя соймікі пачаць і перамагчы ў наступальнай вайне супраць Масквы. Аднак нават прыдворныя раялісты

---

[7] И.О. Тюменцев, *Смута в России в начале XVIII ст.: движение Лжедмитрия*, Волгоград 1999, с. 54–58, 61, 71–79.

[8] Нацыянальны Гістарычны Архіў (НГАБ), КМФ-18, Метрыка Літоўская, спр. 289, воп. 1, арк. 188, 320, 338, 375.

выступалі супраць падтрымкі новага Ілжэдзмітрыя[9]. Магнаты ВКЛ з досведу папярэдніх войнаў разумелі ў што могуць ператварыцца ўдары ў адказ і маршы войскаў па Беларусі, дзе Хадкевічы, Сапегі, Радзівілы і іншыя мелі свае латыфундыі. З усіх вядомых нам інструкцый ВКЛ гэтага перыяду, толькі рэчыцкая і пінская шляхта падтрымала вайну супраць Масквы, а віцебская патрабавала вызваліць з палону паслоў[10]. Пінчукі патлумачыла сваю пазіцыю: "бо такога разліцця крыві братоў нашых… разрабавання ўласнасці нашаму народу, ні ад якога іншага народа не было". Прычым Маскоўскую дзяржаву прапанавалася далучыць цалкам[11].

Пасля дасягнення дамоў з балотнікаўцамі, чачэрскі стараста К. Зяновіч 23 траўня 1607 г. выправіў Ілжэдзмітрыя ІІ на ўсход, пад суправаджэннем чачэрскага ўрадніка Рагазінскага (Рагазы), паддзячага А. Рукіна і прапойскага купца Георгія Кашчыца. Каля Паповай гары „цара" перадалі у Старадуб расійскім паўстанцам і данскому казацкаму атаману родам з Тарнопаля – Івана Заруцкага. На землі казацкага Старадубскага палка асабліва ў памежныя вескі Паповай гары і Раслаўля ад прыгону ўцякала шмат беларускіх сялян і мяшчанства[12], таму для выведкі ВКЛ зладзіць падтрымку Самазванца ў гэтым рэгіене было цалкам рэальна. Царская прапаганда Васіля Шуйскага афіцыйна абвесціла новага Ілжэдзмітра „жыдом-выхрыстам". З мэтай высвятлення асобы „цара" Л. Сапега накіраваў у Старадуб нейкага „жыда Якуба", які быў жаўнерам-наймітам Дзмітрыя І. Апошні пазнаў „цара" і нават павез лісты ад таго да Жыгімонта Вазы. За дзеянні свайго падначаленага Л. Сапега і кароль былі вымушаны тлумачацца. Дадзеная нестыкоўка дазваляе І. Цюменцаву

[9] Archiwum Państwowe na Wawielu, Archiwum Sanguszkow, (APW AS) №51.

[10] Амброзяк Т., Отношение литовских сеймиков …, op. cit., c.182.

[11] Biblioteka ksążąt Czartoryjskich (BCzart), sign. 103, № 258.

[12] Хроленок Е.В. Персональный состав Стародубских казаков накануне Деулинского перемирия (1614–1617): «Письма дозора» 1614 г. // История, политология, социология, философия: теоретические и практические аспекты, Новосибирск, 2018, № 6–7(8), С. 20–26.

казаць аб адсутнасці сувязі Ілжэдзмітрыя са спецслужбамі Рэчы Паспалітай, хаця аўтар следам за савецкай гістарыяграфіяй лічыць, што з лютага па травень 1607 г. шклоўскага валацугу да далейшай ролі падрыхтавалі на землях Беларусі польскі авантурыст Мікалай Мехавіцкі і К. Зяновіч[13].

Ад самага пачатку паходу, ужо 12 чэрвеня 1607 г. „цар Дзмітры" запрасіў да сябе ў наёмнікі жыхароў Магілёва, потым звярнуўся да грамадзян Оршы, Крычава, Мсціслаўя, Менска, Чарнігава. Пры гэтым вярбоўшчыку Зэрстыроўскаму, які быў скіраваны да магілёўцаў, было дазволена абяцаць жаўнерам у 2–3 разы большы жолд чым ім плацілі ў Рэчы Паспалітай, а таксама падарункі і землі пасля перамогі. Аналагічныя прапановы шляхце ВКЛ павезла высакародная асоба – наваградскі ваявода Фёдар (Тэадор/Фрыдэрык) Скумін Тышкевіч. Тым часам, Мікалай Харлінскі[14] і Валенты Валеўскі з аналагічнай місіяй накіраваліся на землі Кароны. Праз сына Крыштофа Зяновіча, Мікалая Багуслава, „Дзмітры І" пераслаў Жыгімонту Вазе ліст з прапановай аднавіць „перарваныя" адносіны, але той адмовіўся прызнаць самазванца і загадаў Л. Сапегу сачыць за выкананнем забароны прапускаць наймітаў у Вялікае княства Маскоўскае (ВКМ)[15].

У адрозненні ад першага Самазванца, дзяржаўныя структуры ВКЛ не здолелі стрымаць свавольны рух памежнай шляхты і мяшчанства, якое прагнула ўзбагаціцца на вайне суседа. Пасля перасячэння маскоўскай мяжы да Ілжэдзмітрыя ІІ, як прыватныя асобы, пачалі далучацца прадстаўнікі ВКЛ. У пачатку верасня 1607 г. з ВКЛ да „царка" прыбыў мазырскі харужы Восіп (Юзэф, Эзоп) Будзіла[16]. Апошні з нейкім „наймітам з Мсціслаўля" меў пры сабе 200 кавалерыі. Верагодна, у большасці з мяшчан ВКЛ была сфар-

[13] Тюменцев И.О., *Смута в России*…, op. cit., с. 75–77.

[14] Мікалай Харлінскі vel Харленскі, сын падкаморыя кіеўскага. S. Uruski, *Rodzina.Herbarz szlachty polskiej*, Warszawa 1905, т. II, с. 150.

[15] И.О. Тюменцев, *Смута в России*…, op. cit., с. 98–101.

[16] *Памятники смутного времени*, Москва 2001, с. 167.

мавана пяхота, якую прывеў да Ілжэдзмітрыя ІІ (?) Воўк[17], а са шляхты ВКЛ – роты Марка Вілямоўскага і Яна Кернажыцкага[18] – ветэранаў вайны ВКЛ са шведамі ў Інфлянтах 1600–1605 г. Мікалай Мехавіцкі прывеў у табар некалькі атрадаў польскай конніцы, ён стаў гетманам, а Г. Кашчыц падскарбіем Самазванца ІІ[19].

Баявая дзейнасць патрабвала грошай. Летам 1607 г. кіеўскі падкаморы Шчэсны Харлінскі дакладаў К. Радзівілу, аб тым, што князь з роду валынскіх Гедымінавічаў – Раман Ружынскі атрымаў ад кракаўскага кашталяна Мікалая Зэбжыдоўскага 60000 злотых на найм войска. Прыгадаем, што і М.Зэбжыдоўскі і Януш Радзівіл у гэты час былі лідарамі рокашу. Пасля таго, як кароль разбіў іх пад Гузавам, наём жаўнераў на Маскву стаў яшчэ больш паспяховым. Ужо восенню роты Ружынскага налічвалі 700 – 1000 гусар і каля 400 пяхоты. Самуэль Тышкевіч прывеў з ВКЛ у лагер Ілжэдзмітрыя ІІ яшчэ 700 коннікаў і 200 пяхоты[20]. Прыбыцце пасілкаў у табары ішло нераўнамерна. Перад паходам на Бранск, у абозе Самазванца караняжаў Р. Ружынскага было каля 500 коннікаў, а ў С. Тышкевіча – 700 гусар і 5 харугваў казакоў. Неўзабаве з кіеўскага ваяводства Кароны прыйшлі Адам Вішнявецкі з 200 гусарамі, паны Мялешка і Хруслінскі

[17] Вядомыя даследчыкам Ваўкі гэта шляхта, якая паходзіла з ВКЛ: з Полацкага, Пінскага і Рэчыцкага паветаў. Магчыма, што сярод іх знаходзіўся Яраш, які ўдзельнічаў у аблозе Смаленска (K. Żojdź, *Wszyscy ludzie króla: Zygmunt III Waza i jego stronnicy w Wielkim Księstwie Litewskim w pierwszych dekadach XVII wieku,* Toruń 2019, с. 347) або Максім, якога набілітаваў сойм у 1616 г. за абарону Смаленска. K. Niesiecki, *Herbarz polskij*, Lipsk 1842, т. IX, с. 410.

[18] Нацыянальны Гістарычны Архіў Беларусі (НГАБ), спр. 85, воп. 1. арк. 429 Прывілей Марку Велямоўскаму на ўладанні ў Віцебскім ваяводстве ў Лужэснянскай воласці: Кучына, Жэчалава, Данілаўшчызна, Сухое ад 21.04.1606 г.; Ян Кернажыцкі верагодна паходзіў з менскай шляхты. S. Uruski, Rodzina. *Herbarz szlachty polskiej*, Warszawa 1909, т. VI, s. 323.

[19] И.О. Тюменцев, *Смута в России…*, op. cit., с. 101–102.

[20] Верагодней за ўсё гаворка ідзе пра сына берасцейскага ваяводы Юрыя Тышкевіча – Самуэль, які загінуў на неакрэсленай „маскоўскай вайне”. K. Niesiecki, *Herbarz polski: w X t.,* т. VIII, Lipsk 1842, s. 176.

з брацлаўкага ваяводства[21]. Адтуль жа прыбылі Мікалай Веляглоўскі Карытко – 12 рот (каля 800 гусар і казакоў), Войцэх Рудніцкі – 120 вершнікаў, Анджэй Хруслінскі – 200 пяцігорцаў, Стэфан Казімірскі – 150 пяцігорцаў. Колькасць наймітаў з Рэчы Паспалітай у войску „царка" вырасла да 4000[22]. Пры гэтым шмат наймітаў, якія апынуліся ў табарах Самазванца, з'язджала бязладна рабаваць па Масковіі.

Зімой 1607–1608 г. – ваявода наваградскі „Стары" (Тэадор) Скумін Тышкевіч прыбыў у лагер Ілжэдзмітрыя II, з ротмістрам Габрыэлем Тупальскім з 400 коньмі кавалерыі і Ян Мікулінскі[23] з 450 былымі інфлянцкімі жаўнерамі. Каля 700 былых ракашан і бандытаў з ВКЛ прыйшло на чале з асуджаным на баніцыю злачынцам Аляксандрам Юзэфам (Эзопам) Лісоўскім[24]. „Цар" скіраваў лісоўчыкаў да данскіх казакоў. Лісоўскі злучыўся з імі і разграміў праціўнікаў Ілжэдзмітрыя II у ваколіцах Разані, Арла і Міхайлава. Вясной яго аддзелы складалі да 2500 ваяроў, сярод якіх пераважалі казакі і рускія[25].

Вясной 1608 г. у войску Самазванца было каля 2000 літвінаў, да якіх далучыўся Павел Руцкі[26] з 1150 ваярамі. Адзначым, што на гэты час у табары была больш добраахвотнікаў з земляў Польскага каралеўства і асабліва той яго часткі, якая зараз з'яўляецца ўкраінскай. У сакавіку 1608 г. князь Р. Ружынскі мёў 1800 коней, у асноўным з Кіеўскага і Брацлаўскага ваяводства. Акрамя яго з Галіцыі прыйшоў Аляксандр Збароўскі (сын былога гетмана Запарожскай Сечы), Мікалай Струсь (любецкі староста, які меў ула-

[21] *Historia wojny moskiewskiej przez Mikołaja Scibora z Marchocic Marchockiego*, Poznań 1841, s. 10.

[22] И.О. Тюменцев, *Смута в России…*, op. cit., с. 109–111.

[23] Іван/Ян Мікулінскі – род з Брацлаўскага ваяводства. S. Uruski, *Rodzina. Herbarz szlachty polskiej*, Warszawa 1914, т. XI, с. 60.

[24] Ротмістр ВКЛ А. Лісоўскі з'яўляўся сынам полькага ратмістра на службе ВКЛ. Першапачаткова ён быў слугам Януша Радзівіла. K. Niesiecki, *Herbarz polski: w X t.,* т. VI. Lipsk 1841, s. 133–134.

[25] *Памятники смутного времени*, Москва 2001, с. 331, 169, 211, 172.

[26] *Баркулабаўскі летапіс* „Беларускія летапісы і хронікі", Мінск 1997, с. 216.

данні на Галічыне і Падоллі), Я. Мікулінскі (450 чал.), Мікалай Веляглоўскі Карытка (600), Валенты Валеўскі (660), Адам Вішнявецкі (960). Разам наймітаў-замежнікаў у табарах Ілжэдзмітрыя II набіралася ад 5620 да 9200. Да іх належыць дадаць каля 3000 запарожскіх і 5000 данскіх і волжскіх казакоў Івана Заруцкага. У першай вялікай бітве – пад Болхавам 30 красавіка 1608 г. у войску Самазванца шляхта Рэчы Паспалітай складала каля 5000 на 12000 агульнай колькасці жаўнераў. Менавіта кавалерыя наймітаў разграміла войскі Шуйскіх[27].

Са снежня 1607 па травень 1608 г. у Маскве да цара Васіля Шуйскага адбывалася новае пасольства ад Жыгімонта Вазы. Начале яго быў полацкі Рурыкавіч – Ян Друцкі Саколінскі і паляк Станіслаў Віткоўскі. Для ВКЛ была актуальна пралангацыя міра з Масквой і вызваленне з турмы вялікіх паслоў А. Гасеўскага, М. Алясніцкага і іншых гасцей вяселля Дзмітрыя I[28]. Перамовы зацягнуліся, але паслы дамагліся вызвалення і злучэння іх з вялікім пасольствам А. Гасеўскага. Хаця на практыцы памежным ваяводам і гетманам было загадана затрымліваць расійскіх паўстанцаў і наймітаў, якія ішлі ім на дапапогу, дыпламаты шантажавалі Васіля Шуйскага, што калі цар не выпусціць палонных, кароль падтрымае Ілэжэпетра і Ілжэдзмітра. Падчас перамоваў з В. Шуйскім, Е. Мнішак выракся „зяця" і па просьбе цара скіраваў да наймітаў Самазванца ад імя Вялікага пасольства Пятра Баркоўскага і пляменніка М. Алясніцкага, а пазней паноў Дамарадскага і Бучынскага з паведамленнем. Разлік рабіўся на тое, што хутка будзе заключаны міждзяржаўны мір, а грамадзяне Кароны і ВКЛ пакінуць межы ВКМ. Хаця наймiты праігнаравалі заклікі дыпламатаў, у ліпені 1608 г. вялікае пасольства і цар заключылі перамір'е і не на два, як планавалася, а на чатыры гады[29]. Выпускаючы дыпламатаў дамоў, В. Шуйскі скіра-

[27] И.О. Тюменцев, *Смута в России…*, op. cit., с.114, 115, 140, 146, 157.

[28] А.В. Дземідовіч, *Вялікае Княства Літоўскае…*, op. cit., с. 2021, с. 57.

[29] Нацыянальны Гістарычны Архіў Беларусі (НГАБ). КМФ – 18. Метрыка ВКЛ, Воп – 1. спр. 596. арк.1–14.

ваў да Жыгімонта Вазы просьбу забраць сваіх падданых у Ілжэдзмітрыя[30].

Вясной 1608 г. у Ілжэдзмітрыя II назбіралася каля 27000 чалавек. Яны разбілі войскі В. Шуйскага ў мілі ад Масквы і ў канцы чэрвеня 1608 г. стварылі ўмацаваны Тушынскі лагер. Прадстаўнікоў Рэчы Паспалітай было сярод іх каля 5600 чалавек, 3000 запарожскіх і 5000 данскіх казакоў. Летам 1608 г. да іх далучылася рота Бабоўскага „з Літвы". Большасць войска тушынцаў складалі расійскія правінцыйныя баяры іх слугі, казакі, халопы і татары. Яшчэ вясной 1608 г. Самазванец скіраваў з Арла на Разань полк А. Лісоўскага. Палкоўнік разграміў войска верных Шуйскім разанскіх і арзамаскіх дваран. Пасля перамогі ён набраў ажно 30000 разанцаў, данскіх і запарожскіх казакоў і павёў іх з вялікім абозам у Тушына. Па дарозе яны захапілі Каломну. Нягледзячы на тое, што тры палкі кінутыя з Масквы на Мядзвежым бродзе разбілі войска А. Лісоўскага 27 чэрвеня 1608 г., перахапілі абоз і вярнулі Каломну – асноўныя сілы лісоўчыкаў зайшлі ў Тушынскі лагер[31]. У траўні 1608 г. Вялікія Лукі, Невель, Завалочча перайшлі на бок Самазванца, ў жніўні да іх далучыліся Тарапец, Белая і іншыя замачкі „літоўскай украіны".

Пасля завяршэння пастракашовага супрацьстаяння Я. Радзівіла і Я.К. Хадкевіча ў ВКЛ у чэрвені 1608 г., жаўнеры пайшлі наймацца на ўсход. Летам 1608 г. да тушынцаў прыбылі Яраш (Геранім) Стравінскі[32] з братамі і 500 гусарамі, Андрэй Млоцкі[33] – 150 гусараў з гарадзенскай канфедэрацыі, (Станіслаў?) Старабороўскі[34] з 200 гусарамі, паны Арлікоўскі, Капычынскі, бацка

---

[30] И.О. Тюменцев, *Смута в России…*, op. cit., с. 73, 161.

[31] Ibidem, с. 166, 178–179.

[32] Браты Геранім (Яраш), Бальтазар, Эразм Крыштоф Стравінскія, шляхта Менскага і Троцкага ваяводства. K. Niesiecki, *Herbarz polski*: w X t. T. VIII. Lipsk 1841, s. 535.

[33] Ротмістр войска ВКЛ у Інфлянтах, паляк, які ажаніўся з літвінкай і асеў ў ВКЛ быў слугам Аляксандра Хадкевіча (K. Niesiecki, *Herbarz polski: w X t.,* т. VI. Lipsk 1841, с. 425–426; K. Żojdź, *Wszyscy ludzie króla…,* op. cit., s. 288).

[34] Верагодней за ўсё, што гэта быў адзін з пяці сыноў кашталяна Пятра

і сын Бохвалы[35] з 200 жаўнерамі. Роты караняжаў Аляксандра Збароўскага і (Станіслава ці Яна) Стадніцкага тады мелі 500 гусараў, літвіны М. Вілямоўскага – 700–800, Я. Мікулінскага – 450 ваяроў. У ліпені–жніўні 1608 г. палітычную сітуацыю ў стане наймітаў на карысць ВКЛ змяніў прыход Яна Пятра Сапегі з 1720 жаўнерамі набранымі з былых берасцейскіх і гарадзенскіх канфедэратаў інфлянцкага войска ВКЛ[36].

Неабходна адзначыць, што кароль і віленскі біскуп па просьбе Л. Сапегі пераконвалі і забаранялі Я.П. Сапегу ісці да тушынцаў. Апошні аднак не паслухаўся. Свавольны ўчынак падарваў давер Л. Сапегі да ротмістра-пляменніка на некалькі год. Хаця спакусліва было б пайсці за сцверджаннямі В. Шуйскага і В. Сабескага і заявіць аб існаванні патаемнай дамовы ротмістра з каралём[37], але на сённяшні дзень у мемуарах, карэспандэнцыі і іншых дакументальных крыніцах адсутнічаюць пераканаўчыя доказы сувязі вялікага канцлера ВКЛ ці каралеўскага двара з Я.П. Сапегам. Таму шэраг даследчыкаў робіць выснову аб прыватным характары ўдзелу праслаўленага ротмістра ў маскоўскай вайне ў якасці найміта, ініцыятыве якога супраціўляліся дзяржаўныя структуры ВКЛ. Зрэшты, каб дамова існавала, падзеі 1609 – 1611 г. разгортваліся б інакш. Магчыма, што асабістым стымулам да ўдзелу ў Дзмітрыядзе для Я.П. Сапегі была яго сувязь з „украінскай” магнатэрыяй.

Пры перасячэнні дзяржаўнай мяжы з ВКМ[38] абраны маршалкам новастворанай канфедэрацыі Я.П. Сапега пачаў караць марадзёраў

---

Стаброўскага, палітычнага рэпрэсаванага пасля рокашу 1606–1609. K. Niesiecki, *Herbarz polski: w X t.,* т. VIII, Lipsk 1841, s. 474.

[35] Боўфал-Дарашкевіч род у Слонімскім і Гарадзенскім павеце. S. Uruski, *Rodzina. Herbarz szlachty polskiej*, т. I., Warszawa 1904, s. 366–367.

[36] *Дневники Яна Петра Сапеги (1608–1611),* Масква 2012, с. 36; И.О. Тюменцев, *Смута в России…*, op. cit., с. 181–182.

[37] W. Sobieski, *Żółkiewski na Kremlu,* Warszawa 1920, s. 8.

[38] В.У. Якубаў, *Першыя канфедэрацыі войска Вялікага Княства Літоўскага і іх уплыў на сітуацыю ў Вялікім Княстве Літоўскім у 1604–1608 гадах* „Веснік Полацкага дзяржаўнага універсітэта” 2008, № 7, с. 34–44.

смерцю, канфіскацыяй маёмасці і выгнаннем[39]. Аднак, ротмістры наймітаў, якія ішлі на ўсход асобна, мелі праблемы з дысцыплінай ужо падчас пастояў у ВКЛ. Так, рота „сапежынцаў" пад камандаваннем Яна Алендзкага разрабавала каштоўнасці Гасеўскіх, якія былі на захаванні ў віцебскіх камяніцах Война ў і Герлінскіх. Перад маршам на Маскву роты П. Руцкага, А. Лісоўскага і А. Млоцкага спляндравалі маёнтак Гуменое віленскага біскупства, а лісоўчыкі – радзівілаўскі Клецк і Брагінскі замак Вішнявецкіх[40].

Увайшоўшы ў межы Расейскага царства, Я.П. Сапега спачатку адрэзаў верны Шуйскім Смаленск ад Масквы, а потым, калі даведаўся, што В. Шуйскі выпусціў палонных і накіраваў іх пад канвоем маскоўскіх войскаў да мяжы ВКЛ, пайшоў ім на перахоп. Па дарозе паслы і канваіры пасварыліся, Марына Мнішак, Е. Мнішак, і М. Алясніцкі выправіліся на Белую, а А. Гасеўскі, С. Вітоўскі, Я. Сакалінскі перайшлі мяжу ВКЛ пад Веліжам. 14 жніўня атрад скіраваны Самазванцам, які складалі роты А. Збароўскага, Я. Стадніцкага, П. Руцкага вызваліў Мнішкаў спад варты. Сапежынцы не сталі спяшацца ў Тушына, а пайшлі да збароўцаў, якія пачакалі іх ў Любініцах. 18–19 жніўня адбыліся перамовы, на якіх Мнішкі аб нечым дамовіліся з „інфлянцамі" і ўсе разам вырушылі да „цара" пад Маскву[41].

Працягваючы ўнутрыдынастычнае супрацьстаянне з Жыгімонтам Вазам на чужой тэрыторыі, Карл IX спрабаваў нацкаваць на Рэч Паспалітую Барыса Гадунова, а потым В. Шуйскага. Працяглыя перамовы 27 лютага 1609 г. завяршыліся Выбаргскімі трактатам з Васілем Шуйскім, паводле якога шведскія гарнізоны павінны былі размясціцца ў Інгерманландыі, Карэліі і на Пскоўшчыне і цар наймаў сабе на службу 2000 вершнікаў і 3000 пехураў. Аднак, яшчэ летам 1608 г., калі на Пскоўшчыну з Масквы вярнуліся мясцовыя

[39] *Дневники Яна Петра Сапеги (1608–1611),* с. 39.

[40] Biblioteka Czartoryjskich (BCzart), Rkps. 102, №. 117; Якубаў В.У., *Першыя...*, op. cit., c. 36.

[41] И.О. Тюменцев, *Смута в России...*, op. cit., c. 186–189.

баяры і ваяры, яны распавялі землякам аб змове Шуйскіх са шведамі. Іх сведчанняў аб „здрадзе цара" хапіла, каб да Ілжэдзмітрыя ІІ перайшлі Себеж, Апочка, Остраў, Ізборск і Краснае. Пскавічы адмовіліся ўпускаць у горад шведаў і, калі тушынскае войска з „гарадоў Літоўскай украіны" падышло пад Пскоў у пачатку жніўня 1608 г., горад адкрыў ім брамы. Тое ж зрабіла большасць прыбалтыйскіх гарадоў: Івангарад, Капор'е, Ладага, Арэшак, Карэла, Ям. Толькі Ноўгарад захаваў адданасць В.Шуйскаму.

З прыходам Я.П. Сапегі ў Тушынскім лагеры налічваў 10000 наймітаў, з якіх 6350 складалі прастаўнікі ВКЛ. Яшчэ больш узмацніў пазіцыі выхадцаў з ВКЛ падвод праз Паволжжа і Уладзімір А. Лісоўскага, які меў прыблізна 5000 літоўскіх і паўднёварасійскіх ваяроў. Паміж Р. Ружынскім і Я.П. Сапегам пачаліся бурлівыя перамовы аб умовах аб'яднання і субардынацыі[42]. Праз некалькі тыдняў, у канцы верасня, у войску Ілжэдзмітрыя ІІ пачаліся складанасці з забеспячэннем Тушына. Тым часам, Р. Ружынскі забіў М. Мехнавіцага і абвесціў сябе вярхоўным гетманам Самазванца, а А. Вішнявецкі быў выгнаны з лагеру.

Каб пазбегнуць далейшых канфліктаў, Ілжэдзмітры ІІ пачаў рассылаць жаўнераў на ўтрыманне па рэгіёнах. У Тушыне засталіся каля 10000 караняжаў, казакоў і расіян пад кіраўніцтвам Р. Ружынскага і І. Заруцкага. Я.П. Сапега быў прызначаны гетманам над наймітамі з ВКЛ і скіраваны са змешаным маскоўска-літоўскім войскам пашыраць уладу Самазванца на паўноч ад Масквы. Яго сілы былі наступнымі: полк Я. Стравінскага – 500 гусараў, М. Вілямоўскага – 700 капійнікаў (гусар і пяцігорцаў) і 200 казакоў, Я. Мікулінскага – 700 капійнікаў і 300 казакоў з гарматамі, роты пяцігорцаў Дзеялтоўскага[43] і Мірскага[44]. Разам з ім з Тушына выйшаў 6-тысячны

[42] Ibidem, c. 160–164, 190–192, 196–197, 201.

[43] S. Uruski, *Rodzina.Herbarz szlachty polskiej*, т. III, Warszawa 1906, c. 360; K. Niesiecki, *Herbarz polski: w X t.,* т. III. Lipsk 1839, c. 473–474.

[44] *Дневники Я.П. Сапеги*, c. 441.

полк маскоўскіх тушынцаў на чале з А. Лісоўскім. Роты А. Млоцкага і Баброўскага былі скіраваны з Тушына ў Серпухаў, адкуль на Каломну, дзе засталіся да развалу тушынскага лагера[45]. Зімой 1608–1609 г. караняжы Р. Ружынскага атрымалі ад Ілжэдзмітрыя II „у кармленне” землі на поўдзень ад Масквы, а сапежынцы – засталіся на поўначы. Маскоўскія ваяводы ў гэты час афіцыйна называлі Я.П. Сапегу „гетманам, панам, каштэлянічам кіеўскім, старастам веліжскім і керапецкім”, а яго войска „літвой”[46].

22 верасня/2 кастрычніка 1608 г. на полі бітвы пад Рахманцавым у 2 мілях ад Троіца Сергіева манастыра войскам Я.П. Сапегі камандавалі А. Лісоўскі, Я. Мікулінскі, М. Велямоўскі, Я. Стравінскі. Сапежынцы разгрмілі каля 15000 войск І. Шуйскага. Гэта параза спрычынілася да самавольнага выезду баяр з Масквы, асабліва тых, чыім дамам „ад літвы і рускіх вароў” пагражала разрабаванне, а пераможцы падышлі пад знакамітую сваім багаццем Троіцка Сергіеўскую лаўру. Манастыр быў моцнай фартэцыяй з 3000 ваяроў, 110 гарматамі і запасам зброі. Войска Я.П. Сапегі восенню 1608 г. мела каля 7000 кавалерыі і 3000 пяхоты з 14 палявымі і толькі адной штурмавой гарматай. Пачалася зацяжная аблога. Пад мурамі Троіцы былі створаны два палявыя лагеры, якія сталі базай сапежынцаў на наступныя два гады. У начы на 1 лістапада адбыўся першы няўдалы вялікі штурм. Больш таго, абложаныя зладзілі паспяховыя вылазкі: 9 лістапада яны захапілі 8 гармат сапежынцаў, а ў баі 28 лістапада забілі Юрыя Горскага, паранілі А. Лісоўскага і Яна Тышкевіча. Атрад наймітаў пад кіраўніцтвам Паўла Руцкага і расійскіх тушынцаў (1150 вершнікаў) у гэты ж час узяў у аблогу Іосіфа Валакаламскі манастыр і на працягу шмат месяцаў спрабаваў яго ўзяць штурмам[47].

[45] *Ibidem,* с. 60, 62; И.О. Тюменцев, *Смута в России…*, op. cit., с. 222, 251–253.

[46] *Памятники смутного времени,* Москва 2001, с. 357–366, 391–396.

[47] И.О. Тюменцев, *Оборона Троице – Сергиева монастыря 1608–1610 гг.*, Москва 2007, с. 15–23, 36; И.О. Тюменцев, *Смута в России…*, op. cit., с. 222–228, 233–234.

З мэтай прывядзення да прысягі „цару Дзмітрыю” Пераяслаўля-Залескага ў кастрычніку 1608 г. з Троіцкага лагеру Я.П. Сапега скіраваў літвіна Пятра Галавача[48], расійскага шведа Цімафея Б’югава і італьянскага наймiта дона Хуана Крузацці з 300 запарожцамі, 3 ротамі гусараў і некалькіх сотняў пераяслаўскіх дваран. Яны занялі месца збору прыхільнікаў Шуйскіх і забралі сабе на службу каля 200 мясцовых дваран і татар. Іх атрад пачаў павялічыўся да 800 ваяроў. Пасля гэтага ўзмацнення ротмістры загадалі Растову прысягнуць на адданасць „цару Дзмітрыю”. Мітрапаліт Філарэт і ваявода Т. Сеітаў сабраўшы 2000 маскоўскіх, растоўскіх, яраслаўскіх і ўладзімірскіх ваяроў, адмовіліся скласці прысягу. У выніку аддзелы П. Галавача рушылі на Растоў. У бітве 15 кастрычніка 1608 г. тушынцы разграмілі Т. Сеітава і ўварваліся ў горад. Яны разрабавалі і спалілі Растоў, а палоннага мітрапаліта накіравалі ў Тушына[49].

Пасля перамогі П. Галавач разаслаў ганцоў з патрабаваннем прысягі мясцовасцей на поўначы. Часта маскоўскія баяры спачатку прыязджалі прысягаць да Я.П. Сапегі, пасля чаго „гетман” адсылаў іх да „царэвіча”. Першымі, ужо 18 кастрычніка ў лагер да Я.П. Сапегі прыехалі прысягаць яраслаўцы, праз дзень усцюжцы, раманаўцы, пашахонцы, кастрамічы, валагодцы і галічане. За кастрычнік – лістапад 1608 г. Суздаль, Юр’еў Польскі, Уладзімір, Арзамас, Мурам, Саратаў, касімаўскія і цемнікаўскія татары, абралі сабе ваяводу і даслалі пасольства не ў Тушына, а да Я.П. Сапегі пад Троіцу. Уладу „цара Дзмітрыя” прызнала большая частка краіны, але, абяцаных ім грошай, найманае войска не атрымала. Тады на агульным рыцарскім коле ў Тушына Андрэй Млоцкі прапанаваў увесці ў Расіі падатак – „панасоўшчыну”, сродкі якога пайшлі б на ўзнагароду наймітам. Жаўнеры прымусілі Самазванца выпісаць ім адпаведныя граматы, забралі акладныя кнігі і іх прадстаўнікі

---

[48] S. Uruski, *Rodzina.Herbarz szlachty polskiej*, т. V, Warszawa 1908, с.166.

[49] И.О. Тюменцев, *Смута в России…*, op. cit., с. 236–239.

паехалі разам расійскімі тушынцамі збіраць гаспадаравы падаткі. Больш таго, як у часы вайсковых канфедэрацый у ВКЛ, гетман Я.П. Сапега распісаў зімовыя Лёжы сваім ваярам на землях „цара" ў паўночнай Расіі, дзе жаўнеры бралі стацыю на свае ўтрыманне з мясцовага насельніцтва.

Пётр Галавач і Ц. Б'югаў, якіх падтрымалі розныя групоўкі яраслаўскіх баяраў, неўзабаве ўвайшлі ў канфлікт паміж сабой. Нягледзячы на тое, што гарнізоны наймітаў Самазванца цалкам выціснулі з уезда бандытаў і свавольнікаў-загоншчыкаў, аднак „літва, палякі і казакі", як і самі расіяне, няшчадна рабавалі сялян і мяшчан. Адзіны, хто мог ім загадаць і ўтрымліваў дысцыпліну, быў Самуіл Тышкевіч. У лістападзе 1608 г. збіраць „панасоўшчыну" па яраслаўскіх уездах пачалі роты Канецкага, Янушкоўскага і М. Уяздоўскага, праз месяц – М. Ксенафонтаў і І. Незбытоўскі. Зімой 1608–1609 г. на Залессі, у Юр'еўскім і Суздальскім паветах мясцовае насельніцтва сцвярджала, што іх рабавала"літва". Менавіта там кватараваліся аддзелы (Я.) Мікулінскага і (Б.?) Стравінскага. Рэагуючы на звароты мясцовых, сілы гетмана з рота Я. Сабалеўскага правялі аблавы супраць марадзёраў і „шмат хлопцаў, пайманых на загонах" пасадзілі ў суздальскую турму. Аднак праблема не знікла. Прыстаўствы ў Закубежскай воласці атрымалі Барацкі і М. Завязкі, у юр'еўскай воласці – Адамовіч, кіржацкі манастыр – Станіслаў Стаброўскі, Пераяслаў – Х. Канвінскі, А. Юшынскі, Я. Лазоўскі. Некаторыя найміты нападалі нават на прадстаўнікоў афіцыйнай „царскай" адміністрацыі. Так, пан Страла з палку Я. Мікулінскага, забраў грошы з падаткаў, якія сабралі тушынцы Т. Крашыньскі і П. Міхалеўскі. Нейкі ротмістр „Яныш" Буякоўскі „ўчыніў ліхую смуту" ў Суздалі, таму мясцовы расійскі ваявода прасіў Я.П. Сапегі яго замяніць. Гэта не перашкодзіла Самуілу Корсаку разрабаваць маёнтак думнага дз'яка П. Трэц'якова. Раззлаваныя сваволляй, мясцовыя жыхары зладзілі змову, але яе выкрылі, а кіраўніцтва пакаралі[50].

[50] Ibidem, c. 222, 244–246, 333–337, 343, 351–355, 361–362.

Прыстаўства Я. Сабалеўскага размяшчалася ва Уладзіміры. Ён і іншыя ротмістры атрымалі загад вынішчаць дэзертыраў, загоншчыкаў і бунтаўнікоў супраць „цара Дзмітрыя”. Уладзімірскі ваявода М. Вільямінаў пры дапамозе рот А. Прыклонскага і М. Акульскага разбілі і павесілі запарожскага атамана Налівайку, які рабаваў ваколіцы Уладзіміра, а камандзір гарнізона Кастрамы Хуан Крузацці пакараў бунтаўніка Яна Унгары. Спробы вярнуць дысцыпліну былі спозненымі. Калі татарскія і тушынскія атрады былі разбітыя пад Ніжнім Ноўгарадам, паўстала мясцовае насельніцтва ў Галічы, Волагдзе, Кастраме Памор’і, Яраслаўлі і Ноўгарадскіх пяцінах. У снежні 1608 г. маскіруючы барацьбу за ўладу паміж баярскімі групоўкамі змаганнем за радзіму, апалчэнцы мабілізаваліся пад слоганы прапаганды Васіля Шуйскага, які ў граматах сцвярджаў што рух Ілжэдзмітрыя ІІ „арганізаваны Літвою каб забіць праваслаўе” і што „богаадступнікі літоўскія людзі і рускія здраднікі”, „ўзялі Самазванца са Старадуба, а ўзяла яго Літва”[51].

На падаўленне паўстанцаў Ілжэдзмітры ІІ скіраваў аддзелы Я.П. Сапегі на Кастраму, на Яраслаўль – А. Лісоўскага, Яраша і Эразма Стравінскіх, Р. Ружынскага – (Яна?) Бонка Ланцкронскага і Казакоўскага – да Усцюга і Бялозера. Аляксандр Сабалеўскі разам з суздальскімі тушынцамі пайшоў караць Шую, Кінешму і Юр’евец. 11 снежня А. Лісоўскі і Я. Стравінскі занялі Яраслаўль, разгramілі апалчэнцаў пад Вялікай Соллю, затым 23 снежня пад Данілавым, і ўжо 28 снежня 1608 г. захапілі Кастраму, а 2 студзеня 1609 – Галіч. У гэты ж час А. Сабалеўскі разбіў шуян. Паўстанцы вярнуліся і разбілі суздальскіх рускіх тушынцаў пад Шуяй, але прысланае падмацаванне на чале з М. Сабалеўскім, Я. Жычэўскім, Я. Мерскім і Дзевялтоўскім 17 лютага 1609 г. адкінула апалчэнцаў ад Суздаля. Разбітыя ледзьве здолелі ўцячы на лыжах. Пераследуючы іх, найміты з ВКЛ спалілі Шую, Плёс і Халуй[52].

---

[51] Ibidem, c. 357, 392 – 393.

[52] *Дневники Я.П. Сапеги,…*, op. cit., c. 76–78; И.О. Тюменцев, *Оборона…*, op. cit., c. 36; И.О. Тюменцев, *Смута в России* 19…, op. cit., c. 293–294, 414.

Калі на поўначы справы Самазванца ішлі больш меньш добра, дык на поўдні Тушынскі лагер перажываў заняпад. Хмялеўскі не здолеў ўзяць Каломну, а Р. Ружынскі быў паранены пад Красным сялом. У студзені 1609 г. рэйд смалян выбіў тысячу запарожцаў Чыжа з Дарагабужа. Самазванец хранічна не плаціў за службу, а таму тушынскія найміты даслалі паслоў на вальны сойм Рэчы Паспалітай і выставілі Ілжэдзмітрыю II рахунак на 17 мільёнаў злотых або 5 мільёнаў рублёў. ”Цар Дзмітры” 11 лютага паспрабаваў уцячы з Тушына, але быў затрыманы. Пры ўсёй складанасці сітуацыі на гэты момант у войску Ілжэдзмітрыя II налічвалася ажно 40000 капійнікаў, размешчаных у сямі лагерах[53]. Авантура дасягнула піку папулярнасці не толькі сярод расіян, але сярод грамадзян Рэчы Паспалітай.

На месцы дыслакацыі найміты супрацоўнічалі з маскоўскімі баярамі. Так, яраслаўскі ваявода выправіў у паход 200 „літвы”, казакоў і татар на чале з П. Галавачом, якія разбілі 11 сакавіка 1609 г. пад Раманавам валагодскае і паморскае апалчэнне. Аднак, як толькі войска тушынцаў сканцэнтравалася ў Яраслаўлі, пакінула Раманаў і ваколіцу, апошні зноў апынуўся ў руках апалчэнцаў. 27 сакавіка 1609 г., супраць тушынцаў паўстаў Уладзімір, а перад гэтым Мурам. А. Лісоўскі і М. Вілямоўскі накіраваліся на падтрымку Уладзіміра-Суздальскай групоўкі[54].

У канцы сакавіка – пачатку красавіка 1609 г. А. Млоцкі заблакаваў гарнізон верны Шуйскім у Каломне і перахапіў усе абозы з поўдня да Масквы. Ужо ў сярэдзіне красавіка ў Маскве пачаліся цынга, голад і змовы супраць Васіля Шуйскага. Толькі 17 ліпеня 1609 г. маскоўскія войскі здолелі адагнаць А. Млоцкага ад Каломны і расчысціць шлях для дастаўкі харчавання ў Маскву. У гэты ж час 3000 казакоў і пяцігорцаў А. Лісоўскага і Я. Стравінскага пера-

[53] *Памятники смутного времени,…*, op. cit., c. 61; И.О. Тюменцев, *Смута в России…*, op. cit., c. 398–400.

[54] И.О. Тюменцев, *Оборона…*, op. cit., c. 41.

духілілі чарговае паўстанне суздальцаў. Потым яны падышлі да Уладзіміра, дзе 3 красавіка разбілі і загналі мясцовых апалчэнцаў у горад. Узяць гэтую фартэцыю амаль без артылерыі было немагчыма. Тым больш, паколькі 9 красавіка паўстаўшыя яраслаўцы перабілі тамтэйшы гарнізон, а ротмістры Страла і С. Тышкевіч ледзьве выратаваліся, лісоўчыкам давялося здымацца з пад Уладзіміра. Яны пайшлі на злучэнне з Я. Мікулінскім, А. Ружынскім, В. Будзілам і іншымі сапежынцамі, каб выпраўляць сітуацыю. Паралельна ротмістр Сума і растоўскі ваявода І. Навумаў занялі Кастраму і адпомсцілі за забойства мясцовымі паўстанцамі прыхільнікаў Ілжэдзмітрыя ІІ. Да іх на падмацаванне прыйшоў полк С. Тышкевіча. Сілы тушынцаў у Кастраме склалі каля 1000 шабляў[55].

Войскі на чале з В. Будзілам і Я. Мікулінскім у баях 6–9 траўня 1609 г. разбілі астраханскіх, сібірскіх і мясцовых паўстанцаў пад Яраслаўлем, спалілі і захапілі яго пасад. Аднак за ўвесь май літвіны так і не здолелі ўзяць мураваны крэмль і Яфімаў манастыр. Пасля чаго адышлі да асноўных сілаў на чуткі аб разгроме групоўкі Я. Кернажыцкага і аб руху апалчэнняў М. Скопіна Шуйскага і шведаў з Ноўгарада[56]. Пакуль ішлі баі за Яраслаўль, апалчэнцы напалі (з Уладзіміра) на Суздаль і (з Мурама) на Касімаў. У адказ тушынцы і ротмістр Сума ўдарамі з Суздаля ў чэрвені спалілі пасады Уладзіміра, а полк Я. Мікулінскага – захапіў Угліч. З сярэдзіны чэрвеня А. Лісоўскі, В. Будзіла і тушынцы занялі Юр’евец Паволжскі, спалілі Кінешму і імкнуліся прарвацца ў Кастраму, дзе апалчэнцы ўзялі ў аблогу ў Іпацеўскім манастыры гарнізон. У 3-дзённым баі літвіны разграмілі паволжскіх апалчэнцаў, забілі іх кіраўніцтва, але 28 ліпеня не здолелі захапіць варожы флот, каб пераправіцца праз Волгу ў Кастраму. Калі яны адступілі ў накірунку Троіцы, Іпац’еўскі манастыр здаўся апалчэнцам[57].

---

[55] И.О. Тюменцев, *Смута в России…*, op. cit., с. 411–414, 448.

[56] *Из дневника И. Будиллы* [w:] *Памятники смутного времени*, Москва 2001, с. 177–178; И.О. Тюменцев, *Смута в России…*, op. cit., с. 414–416.

[57] И.О. Тюменцев, *Смута в России…*, op. cit., с. 418, 444.

Перамога Я.П. Сапегі над войскамі Шуйскіх пад Рахманцавым восенню 1608 г. і дамова В. Шуйскага аб здачы шведам Карэліі, зрабілі магчымым рух на поўнач для войска Самазванца. Полк Яна Кернажыцкага ў сярэдзіне лістапада 1608 г. разграміў сілы Міхаіла Скопін Шуйскага і заблакаваў Ноўгарад да вясны 1609 г. Яго полк складалі 2000 нізавых казакоў палкоўніка Грыца і каля 6000 расійскіх тушыцаў з Пскова і „літоўскай украіны”. У лютым 1609 г. атрад Мікалая Касакоўскага зрабіў рэйд на Усцюжну Жэлезнапольскую[58]. Вычарпанне мясцовых рэсурсаў і тое, што Я.П. Сапега і Я. Кернажыцкі паверылі дэзінфармацыі царскай прапагнады аб падыходзе да Ноўгарад 15000 шведскіх падмацаванняў да М. Скопін Шуйскага, спрычыніліся для пачатку стратээгічнага адступлення. У рэчаіснасці шведскіх наймітаў прыйшло 3000 вершнікаў і 2000 пяхоты да якіх далучылася тысяча мясцовых прыхільнікаў Шуйскіх[59].

Пачынючы вайсковую кампанію ў Маскоўскай дзяржаве шведы разлічвалі акупаваць Наўгарод і Пскоў, а прынамсі іх прыбалтыйскія воласці. Каб гэты план не стаў рэчаіснаццю адразу пасля прыхода шведскага арміі, М. Скопін Шуйскаму прышлося выплаціць наймітам Я. Дэлагардзі аванс за будучы паход і перадаць Швецыі Карэлу. Толькі пасля гэтага ў траўні 1609 г. саюзнікі вырушылі ў паход на Маскву. На чуткі аб пачатку выправы шведаў і скопінцаў адбыліся гарадскія перавароты ў Таржку, Тарапцу, Ржэве, Холму, Белай, Старай Русе. Скопінцы пад Цверру разбілі каля 500 наймітаў, падмацаваных запарожцамі, на чале са Станіславам Панятоўскім[60]. Масавыя сутыкненні адбыліся ў Пскове, але праскопінскіх паўстанцаў удалося апанаваць, пасля чаго пскавічы адбілі наўгародцаў і шведаў ад горада. Пачаткам агульных поспехаў наўгародцаў – скопінцаў стала тое, што перадавы атрад саюзных ім

[58] А.А. Селин, *Смута на Северо-Западе в начале XVI века: очерки из жизни новгородского общества,* СПб, 2017, с. 360.

[59] И.О. Тюменцев, *Смута в России…*, op. cit., с. 247–248, 391.

[60] *Памятники смутного времени…*, op. cit., с. 385.

шведаў Э. Горна, знянацку застаў п'яных казакоў у вёсцы Каменцы і іх разграміў. Я. Кернажыцкі адышоў са Старай Русы да Ржэва з 30 таварышамі[61]. Войскі, якія складаліся з наўгародцаў, шведаў і наймітаў Міхайла Скопін Шуйскага, дагнала і разбіла групу адступаючых пад Тарапцом 15 траўня 1609 г.

У Троіцкім і Тушынскім лагерах пачалася канцэнтрацыя сіл на рашаючыя дзеянні, якія суправаджаліся адпраўкай нарабаванай „рухлядзі" ў Літву. З вялікімі цяжкасцямі на поўнач з Тушына ўдалося выправіць 1500 вояроў А. Збароўскага і баярына І. Шахоўскага. Самі тушынцы няўдала паспрабавалі штурмаваць Маскву 5 чэрвеня. „Царык" выклікаў Я.П. Сапегу сабе на дапамогу, але апошні вырашыў сваімі сіламі штурмаваць Троіцу. Тым часам, кавалерысцкія палкі С. Панятоўскага, А. Збароўскага і Я. Мікулінскага з Угліча, 2000 вершнікаў з Рэчы Паспалітай і 1000 рускіх тушынцаў выправілася на падтрымку Я. Кернажыцкага на Таржок. У чэрвені 1609 г. пад булавой Я.П. Сапегі было каля 3000 наймітаў і 5000 сялян-тушынцаў. 28–29 чэрвеня 1609 г. ён паспрабаваў правесці штурм Троіца Сергееўскага манастыра, але большасць сялян паўцякала са штурмавых калон і абозу. Пасля чарговай няўдачы, частку сваіх войскаў Я.П. Сапега павёў на Цвер, але на бітву не паспеў. Гэтыя падмацаванні, якая злучыліся з сіламі Я. Кернажыцкага, дазволілі сабраць каля 2000 гусар і 6000 запарожскіх казакоў[62].

17 чэрвеня 1609 г. адбылася бітва пад Таржком. Апалчэнцы М. Скопін Шуйскага апёрліся на нямецкіх кнехтаў і горадскія ўмацаванні, якіх рыцарская кавалерыя „літоўскія людзі" А. Збароўскага[63] не сталі штурмаваць. Пасля паспяховых атак на розных участках бітвы камандаванне загадала адыходзіць у Цвер і запрасіла новага падмацавання з Тушына. Ідучы на канцэнтрацыю 27 чэрвеня Я.

[61] И.О. Тюменцев, *Смута в России…*, op. cit., c. 437–439.

[62] И.О. Тюменцев, *Оборона Троице – Сергиева…*, op. cit., c. 47–48; И.О. Тюменцев, *Смута в России…*, op. cit., c. 441–442.

[63] *Памятники смутного времени,…*, op. cit., c. 394–396.

Мікулінскі перамог апалчэнцаў пад Гарадцом, аднак дазнаўшыся аб паразе пад Таржком, адыйшоў да Калязіна[64].

У Цверы адбылася канцэнтрацыя паўночных сілаў Ілжэдзмітрыя II. З Тушына прывялі роты паны Хруслінскі, Цаглінскі, Бялінскі, Карытка, Павала і Я. Тышкевіч, з Троіцы – М. Вілямоўскі, з Яраслаўля – А. Ружынскі. Разам было каля 4000 ваяроў. 11 чэрвеня адбылася бітва пад Цверу. Пасля зацятай сечы гусары апракінулі нанятую шведамі кавалерыю і прагналі апалчэнцаў з поля. Пасля чаго пераможцы зайшлі ў Цвер на адпачынак[65]. Скопінцы нечаканым начным ударам 13 чэрвеня 1609 г. выбілі тушынцаў з пасадаў Цвяры.

Развіваючы поспех у пасадзе, войскі Шуйскіх і найміты чатыры разы няўдала штурмавалі цвярскія ўмацаванні – „осыпь", дзе сядзеў гарнізон на чале з „панам Красоўскім і літоўскім людам". Страты, якія штурмуючыя панеслі ў Цверы, так уразілі нямецах наймітаў, што яшчэ ў лютым 1610 г. яны адмовіліся ісці на прыступ Дзмітрава, які абараняли сапежынцы. Так ці інакш, пасля перамогі пад Цверам, шведскія найміты запатрабавалі аплаты, а паколькі ў М. Скопін Шуйскага грошай не было, большасць французаў і немцаў вырушыла дадому. Я. Дэлагадзі затрымаў пры сабе толькі каля 2000 жаўнераў[66].

Сканцэнтраваўшыся пад Троіцка Сергіеўскім манастыром, А. Збароўскі, Я.П. Сапега, Касцінецкі, М. Вілямоўскі, Б. Ланцкронскі і рускія тушынцы, ноччу 29 ліпеня 1609 г. трэці раз няўдала штурмавалі манастыр. Аднак 28 жніўня ротмістр Сума ўдалай атакай пад Суздалем спыніў паспяховы дагэтуль марш ніжагародскага апалчэння на Маскву. Калі ў верасні 1609 г. узнавіўся рух М. Скопін Шуйскага да Волгі, супраць яго з пад Троіцы выйшаў гетман Я.П. Сапега, А. Лісоўскі, А. Збароўскі, Б. Ланцкронскі[67].

---

[64] *Ibidem,* с. 180, И.О. Тюменцев, *Смута в России…*, op. cit., с. 443.

[65] И.О. Тюменцев, *Смута в России…*, op. cit., с. 445.

[66] *Памятники смутного времени,…*, op. cit., с. 397; *Дневники Я.П. Сапеги,…*, op. cit., с. 186; И.О. Тюменцев, *Смута в России…*, op. cit., с. 447.

[67] И.О. Тюменцев, *Смута в России…*, op. cit., с. 451.

Сітуацыя наймітаў-грамадзян Рэчы Паспалітай на службе Ілжэзмітрыя II змяняецца з уступлення ВКЛ і Польскай кароны ў міждзяржаўную вайну з Вялікім княствам Маскоўскім. Пасля канчатковага спынення рокашу на Варшаўскім вальным сойме1609 г. у Жыгімонта Вазы вызваліліся рукі. Аднак сенатары з ВКЛ, на чале з Хадкевічамі і Радзівіламі, запратэставалі супраць непадрыхтаванага нападу і заблакавалі разгляд пытання аб пачатку вайны з Масквой. Л. Сапега выказаўся на сойме за вайну, але, адначасова, адмоўна выказаўся наконт намераў караля ў лістах да Радзівілаў. У выніку вальны сойм 1609 г. скіраваў ухваленыя падаткі на выплату войскам у Інфлянтах, іх канфедэрацыям і прадухіленню іншых небяспекаў[68]. Тым не менш, ужо вясной 1609 г. стомленыя рабаўніцтвамі сваіх уладанняў войскамі канфедэратаў і добраахвотнікаў, якія ішлі на ўсход, сенатары ВКЛ змянілі свой ранейшы антываенны настрой. Літоўскія сенатары прапанавалі каралю вывесці жаўнераў ці ў Інфлянты, ці пад Пскоў і Вялікія Лукі[69].

Да жніўня 1609 г. кароль спрабаваў пераадолець унутрыпалітычны супраціў магнатаў ВКЛ і толькі пасля поспехаў войска ВКЛ у Інфлянтах зімой – летам 1609 г., абвесціў аб пачатку паходу на Смаленск. Гэта было зроблена без афіцыйнага дазволу вальнага сойму і сенату Рэчы Паспалітай, што з’яўлалася парушэннем права. Вырашальную ролю ў прыспешванні нападу на Смаленск, адыгралі Л. Сапега і А. Гасеўскі, якія пераканалі караля, што горад адразу здасца. Роты выстаўленыя Сапегамі з’явіліся пад мурамі Смаленска ў сярэдзіне верасня 1609 г. Праз некалькі тыдняў з каралём падышлі сілы іншых магнатаў ВКЛ і Каронны[70]. Войскі Жыгімонта Вазы не мелі сур’езнай артылерыі і не былі падрыхтаваны да штурмавых прац, а таму завязлі пад Смаленскам да 3 чэрвеня 1611 г.

Першай аперацыяй сапежынцаў, на якую паўплывала зборы караля пад Смаленск, сталі падзеі пад Калязінам. 14 жніўня 1609 г.

[68] А. Дземідовіч, *Вялікае Княства Літоўскае*..., op. cit., с. 61.
[69] APW, AS, №51.
[70] BCzart, sign. 104, №216.

роты Будзілы, Чаплінскага, Тышкевіча і Каліноўскага занялі Рабаў манастыр і заблакавалі пераправу М. Скопін Шуйскага і шведаў праз Волгу. 18 жніўня яны загналі ў палявы лагер, адрэзалі ад Волгі частку скопінцаў і нямецкіх наймітаў, але штурмаваць Калязінскія ўмацаванні не сталі. Калі да рыцарства вярнуліся з Тушына паслы і распавялі, што Жыгімонт Ваза плануе наступ з Вільні на Смаленск, найманае рыцарства, баючыся, што „царок" уцячэ і ім не заплоціць ня скончыўшы аблогу, зняліся з лагера і паехалі да Я.П. Сапегі пад Троіцу[71].

Лінія абароны тушынцаў значна аслабла. Каб паспець хутчэй за канкурэнтаў да Тушына, у Пераяслаўлі ад асноўных сілаў Я.П. Сапегі канчаткова аддзяліліся палкі караняжаў А. Збароўскага, Ланцкронскага і Касцянецкага. Маючы досвед марнавання перамог канфедэрацыямі інфлянцкага войска ВКЛ і разумеючы, што грошай у Самазванца няма, гетман абвесціў агульны збор усіх сваіх войскаў у лагеры каля Троіцы. З Растова былі выкліканы гусары Я. Мікулінскага, на замену якім накіраваліся 2000 казакоў А. Лісоўскага. Каля тысячы рускіх тушынцаў складалі гарнізон Пераяслаўля Залескага, на падтрымку якога вырушылі гусары Стэцкевіча і казакі Цярлікоўскага. Э. Стравінскаму яшчэ ўдалося разграміць рэйд скопінцаў пад Дзмітравам, але 8 верасня адбылося паўстанне ў Пераяслаўлі Залескім і 4 роты гарнізона горада былі знішчаны. Асноўныя сілы М. Скопін Шуйскага атабараліся ў Пераяслаўлі і Аляксандравай слабадзе. Праз некалькі тыдняў А. Лісоўскі паспрабаваў адбіць горад. Пацярпеўшы няўдачу, лісоўчыкі зняліся з базы ў Растове і вярнуўся ў Суздаль. Пасля іх прыхода, Я. Стравінскі паспяхова прарваўся з Суздаля да Троіцы[72].

Найміты ў Тушынскім лагеры склалі  канфедэрацыю, якой Ілжэдмітры II паабяцаў перадаць Северскую і Разанскую зямлю

[71] *Памятники смутного времени…*, op. cit., c. 180–181; И.О. Тюменцев, *Смута в России…*, op. cit., c. 453.

[72] И.О. Тюменцев, *Смута в России…*, op. cit., c. 454 – 455.

ў якасці кампенсацыі іх заробку і страт. Аб новай канфедэрацыі Я.П. Сапега даведаўся ад паслоў 27 верасня 1609 г. у сваім лагеры. Аднак замест таго, каб далучыцца для пабрацімаў, ён пачаў сепаратныя перамовы з Жыгімонтам Вазам і Л. Сапегам аб прызнанні імі даўгоў па аплаце, якія ён нарабіў на службе Ілжэдзмітрыю ІІ. Казакі Веляглоўскага і Кернажыцкага, якія кватараваліся ў Вязьме, абвесцілі аб далучэнні да войскаў Рэчы Паспалітай.

Працягваючы змаганне за Самазванца і ўзнагароды, 11 кастрычніка тушынскія канфедэраты правялі начны штурм Масквы, але прарвацца ў горад ня здолелі. Апошнім буйным поспехам тушынцаў у кастрычніку 1609 г. стала авалоданне Іосіфа Валкаламскім манастыром. Каб пазбегнуць кары за супраціўленне, капітулючыя адчынілі брамы не П. Руцкому, а Р. Ружынскаму. Развіваючы поспех, тушынскі гетман узяў з сабой каля 2000 палякаў і 18 кастрычніка 1609 г. прыйшоў на дапамогу Я.П. Сапегу пад Троіцу. Аднак два дні раней, нечаканым ударам абоз скопінцаў прарваўся праз аблогу ў Троіцкі манастыр. Далейшая аблога стала бяссэнсоўнай. Да таго ж сустрэўшыся, два гетманы не паладзілі. У выніку, на бітву з М. Скопін Шуйскім пад Аляксандраву Слабаду выйшлі караняжы і тушынскія расіяне, падмацаваныя толькі некалькімі ротамі літвінаў. Ім удалося пад сялом Корына знішчыць перадавыя часткі апалчэнцаў, але ў баях 19–24 кастрычніка 1609 г. шведы і скопінцы схаваліся за ўмацаваннямі і не выходзілі біцца ў полі. Штурмаваць бастыёны і засекі без артылерыі атакуючым каштавала шмат крыві. Калі пачаліся маразы, Р. Ружынскі адступіў да Троіцы, а потым – у Тушына[73]. 26 кастрычніка 1609 г. А. Млоцкі разграміў канвой з харчаваннем і зноў пачаў аблогу Каломну.

Пасля прыхода ружынцаў у Тушына туды ж прыбыла пасольства ад Жыгімонта Вазы. Кіраўніцтва Рэчы Паспалітай ніколі не прызнавала Ілжэдзмітра ІІ царом і, спрабуючы звабіць сваіх суайчыннікаў да сябе пад Смаленск, Жыгімонт Ваза тым не менш,

[73] Ibidem, c. 456–461.

не хацеў прызнаць яго даўгі. 10 снежня 1609 г. паслы ад караля абвінавацілі тушынскіх наймітаў у правакацыі вайны Рэчы Паспалітай са Швецыяй і Масквой, што магло пагражаць пазбаўленнем іх шляхецтва і баніцыяй. Дзякуючы А. Млоцкаму, які пабіўся на шаблях з папярэднім паслом тушынцаў да караля, на павестцы агульнага сходу стала ідэя сапежанцаў аб выплаце каралем кампенсацыі службы на „царка" за кошт акупацыі імі Смаленшчыны і Севершчыны, але ўжо ад імя Жыгімонта Вазы. Каралеўскія паслы, аднак, не пагадзіліся з прапановамі жаўнерскага кола і пачалі персанальныя перамовы з камандзірамі баяздольных частак аб пераходзе на дзяржаўную службу. Публічныя перамовы, якія суправаджаліся дэманстратыўнай пагардай і пагрозамі Самазванцу, прывялі да спробы ўцёку „царыка" з Тушына. Найміты яго аднак злавілі і пасадзілі пад арышт.

Уцячы ў Калугу з-пад аховы Ілжэдзмітрыю II ўдалося пры дапамозе расейскіх тушынцаў толькі 27 снежня 1609 г. Цяпер Самазванец стаў патрыётам, пачаў барацьбу супраць замежнікаў і здраднікаў. Ужо 3 студзеня 1610 г. расіяне, верныя Ілжэдзмітрыю II, напалі і разбілі атрад А. Млоцкага. Тады ж Ф. Тышкевіч пачаў перамовы з Самазванцам, а Я. Кернажыцкі ўвеў сваіх запарожскіх казакоў у Калугу. Частка тушынскіх баяр вярнулася ў Маскву да Шуйскіх дзе абвесціла, што „літва збіраецца на пабег" з Тушына[74].

Адступленне сапежынцаў восенню 1609 г. не азначала руху М. Скопін Шуйскага наперад. Я. Дэлагардзі, выконваючы загады шведскага караля настойваў на тым, каб новая партыя наймітаў далучылася да манарха толькі пасля рэальнай перадачы Швецыі Івангарада і іншых замкаў, паколькі расійскі гарнізон Карэлы адмовіўся разглядаць здачу апошнім і нават не запусціў паслоў ад М. Скопін Шуйскага ў горад. Разгром рэгулярнай шведскай арміі ў Інфлянтах Я.К. Хадкевічам у верасні 1609 г і набліжэння войскаў Рэчы Паспалітай да Смаленска прымусілі Карла IX пагадзіцца накіра-

[74] Ibidem, c. 467–471.

ваць Шуйскім у Аляксандраву Слабаду 4000 еўрапейскіх наймітаў. Толькі атрымаўшы падмацаванне на пачатку студзеня 1610 г. войскі М. Скопін Шуйскага з 50000 рускіх апалчэнцаў, 1330 шведскімі кавалерыстамі і 900 пехурамі падышлі пад Троіцу. Пасля ўпартых баёў з 12 па 27 студзеня і спробаў выцягнуць ворага на бітву ў поле, Я.П. Сапега быў вымушаны адступаць у Дзімітраў. Калі 19 лютага 1610 г. пад горад падышлі асноўныя сілы Шуйскіх, 400 сапежынцаў і тысяча казакоў пайшлі ў атаку. Пасля боя расіяне адступілі да Троіцы, але і сапежынцы, спаліўшы ўмацаванні Дзмітрава, вырушылі праз Ржэў на Тушына. Ранняй вясной 1610 г. А. Лісоўскі выправіўся з Суздаля праз Цвер і Вялікія Лукі на Пскоў. Па дарозе лісоўчыкі спалілі Растоў і Калязін манастыр[75].

Уцёкі „царка" прымусілі Я.П. Сапегу і Р. Ружынскага пагадзіцца на далучэнне да войска Жыгімонта Вазы і збірацца да Смаленска. У лютым 1610 г. М. Мінішак і большасць тушынцаў прызнала царом Уладзіслава, але Ф. Тышкевіч прывез у Тушына ліст ад Ілжэдзмітрыя II, у якім апошні абвінаваціў Р. Ружынскага, П. Руцкога і іншых у здрадзе і паабяцаў разлічыцца за старыя даўгі і новы наём, калі жаўнеры прывядуць да „цара" яго „жонку". Я. Тышкевіч зрабіў спробу скінуць уладу Р. Ружынскага. Паміж двума партыямі тушынцаў на вайсковым коле адбылася бойка. Жаўнеры здолелі своечасова спыніцца і дачакацца вяртання паслоў ад караля, аднак калі апошнія чарговы раз не прывезлі грошы, 6–8 сакавіка 1610 г. войскі пакінула і спалілі Тушынскі лагер. 12 сакавіка 1610 г. скопінцы і шведы увайшлі ў Маскву.

Роты А. Збароўскага, А. Млоцкага, М. Велямоўскага і некаторыя іншыя перайшлі адразу на службу караля. Астатнія, горш узброеныя роты, увесну 1610 г. ваганіся. Раман Ружынскі з большасццю тушынцаў скацэнтраваўся ў Іосіфа Валакаламскім манастыры, дзе памёр у выніку атрыманых ран. 11 траўня 1610 г. пад манастыр падышлі аб'яднаныя сілы шведаў і Шуйскіх. У дадзенай сітуацыі

[75] *Szwedzkie wojny 1611–1632*, Oświęcim 2015, s. 30.

былыя тушынцы пад кіраўніцтвам Паўла Руцкога вырашылі адступаць на злучэнне з каралём. Аднак яны трапілі ў засаду і былі разбіты. У палон патрапілі Г. Тупальскі, Філарэт і А. Ружынскі. Самому П. Руцкаму ўдалося вырвацца.

Узімку 1610 г. калужскай стаўцы Ілжэдзмітрыя II працягвалі падначальвацца Пскоў, Вялікія Лукі, Арзамас, Астрахань, Севершчына і прыбалтыйскія гарады. Яго войска са студзеня 1610 г. узначалілі Г. Шахоўскі і Я. Кернажыцкі. Незабаве, у Калугу падышлі роты Хруслінскага, Янікоўскага, а роты Быхаўца і Каменскага, перадалі Самазванцу Валакаламск, а самі адышлі ў Медынь і Прудкі, дзе была абвешчана месца збору для іншых наймітаў. 3 красавіка 1610 г. палкоўнік ВКЛ А. Гасеўскі захапіў Белую, запарожцы і кіяне прымусілі жыхароў Чарнігава і Севершчыны цалаваць крыж каралевічу Уладзіславу Вазе.

У гэты ж час тушынскі ваявода Ф. Пляшчэеў, сабраўшы 6000 пскавічоў і жыхароў гарадоў „літоўскай украіны”, няўдала паспрабаваў адбіць у шведаў Вялікі Ноўгарад. Прыйшоўшы на Пскоўшчыну А. Лісоўскі звабіў да сябе 700 ірландскіх і англійскіх наймітаў і дапамог пскавічам адбіцца ад шведскіх нападаў з Нарвы, зрабіўшы паспяховы рэйд разам з вялікалуцкімі казакамі пад Іван-горад. Аднак у рэшце рэшт шляхі А. Лісоўскага і тушынцаў канчаткова разышліся. Калі пераможцы вярталіся назад, пскавічы адмовілі ім пастоя ў горадзе. Раззлаваныя лісоўчыкі перабазаваліся ў Краснае, Завалочча і Вароніч – на паўночным памежжы ВКЛ. Расійскія казакі з палка А. Лісоўскага перайшлі на бок царскага ваяводы Г. Валуева і дапамаглі яму выразаць тушынцаў у Вялікіх Луках[76]. У 1610–1611 гг. лісоўчыкі рабілі глыбокія рэйды на Пскоўшчыну і Навагародчыну рабуючы і спыняючы канкурэнтаў. Вальны сойм 1611 г. зняў баніцыю з А. Лісоўскага і афіцыйна наняў

[76] *Памятники смутного времени…,* op. cit., с. 223; И.О. Тюменцев, *Смута в России,* op. cit., с. 472–494.

яго на службу[77]. 11 лютага 1612 г. яго „літоўскія і польскія людзі" спалілі Старую Русу[78]. Пачынаючы з 1612 г. манарх адсылаў татар ВКЛ пад яго каманду[79] і ў 1613 г. афіцыйна лічыў Завалочча далучаным да ВКЛ[80].

23 чэрвеня пяхота выбіла царскія войскі з грэбляў і забяспечала пераход асноўных сіл Рэчы паспалітай да Царова Займішча[81]. 24 чэрвеня/4 ліпеня 1610 г. прыняўшы у свае шэрагі 1500 збароўцаў войска С. Жалкеўскага пад Клушынам ушчэнт разграміла царскую армію. Большасць войска пераможцаў пад Клушынам складалі караняжы, але вельмі важную ролю ў бітве адыграў полк былых тушынцаў А. Збароўскага і Людвіга Панятоўскага з ротамі Я. Скуміна Тышкевіча і А. Гасеўскага[82]. Разлік з гэтымі ротамі, як і з інфлянцкімі і смаленскай залогай у 1613 г. быў даручаны скарбу ВКЛ. Гэта сведчыць аб тым, што ў яго складзе пераважна былі прадстаўнікі ВКЛ[83]. Войскам Жыгімонта Вазы здаліся Цвер, Бароўск, Осіпаў і шэраг іншых[84].

Тым часам прамарнаваўшы паўгады ў перамовах з Жыгімонтам Вазам і не атрымаўшы задавальнення сваіх патрабаванняў ад Рэчы Паспалітай, Я.П. Сапега, 6 чэрвеня прывеў Ілжэдзмітрыю ІІ тысячу сваіх ваяроў, заняўшы Угру. 15 чэрвеня 1610 г. на агульным вайсковым коле былых расійскіх тушынцаў, сапежынцаў і казакоў Я.П. Сапега быў абраны гетманам усяго войска Самазванца. Грошай выплаціць нават аванс за службу Ілжэдзмітры ІІ ня меў, але 24 чэрвеня прыбыў у вайсковы лагер на Угры. Калі звесткі аб клушынскім разгроме пацвердзіліся і былыя тушынскія баяры на

[77] Volumina Legum, T. III, 1860, s. 25.
[78] А.А. Селин, *Смута на Северо-Западе,* op.cit., c.157.
[79] НГАБ, КМФ – 18. Воп. – 1, спр. 293, арк. 66 аб., 67, 106, 108 аб.
[80] Ibidem, арк. 220.
[81] ЛННБУіВС., Ф.103. Воп. IV – спр. 569 арк. 8–9.
[82] T. Bohun, *Moskwa 1612,* Warszawa 2005, c. 33–35.
[83] Volumina legum t. III, 1860, c. 114.
[84] Lietuvos Mokslu Akademijos Vrublevskiu Biblioteka (LMAVB), f. 9–431, арк. 143.

чале з Філарэтам паабяцалі дапамагчы з уваходам у Маскву, войскі Самазванца рушыла ў паход. Асноўнай баявой сілай і афіцэрскага корпуса зноў былі найміты з ВКЛ: полк Я.П. Сапегі – 100 гусар, 600 пяцігорцаў, 300 казакаў; В. Будзілы – 200 гусар, 600 пяцігорцаў, 400 казакоў; С. Тышкевіча – 200 гусар, 600 пяцігорцаў, 100 казакоў; А. Хруслінскага 200 гусар, 600 пяцігорцаў, 200 казакоў, а так сама роты Стравінскага, Камянецкага, Таляфуса, два палкі запарожцаў Друшлака і Касцінецкага. Казацтва і расійскія баярскія сілы самазванца складалі большасць, але не вызначаліся якасцю. Разам набіралася каля 5000 войска[85].

На шляху да Масквы 5 ліпеня 1610 г. войскі Самазванца ўзялі і разрабавалі Бароўскі Пануфрыеўскі кляштар, перабіўшы ўсіх абаронцаў. Пасля перамогі, Я.П. Сапега 5-дзённымі манеўрамі прымусіў адысці ад Масквы войскі паўднёварасійскіх баяр і крымскіх татар, якія ішлі на дапамогу Шуйскім, а таксама пазбегнуў сутычкі з войскамі С. Жалкеўскага. 17 ліпеня 1610 г. цар Васіль Шуйскі быў зьлажоны з пасада. Але 23 ліпеня насуперак чаканням, масквічы адмовіліся цалаваць крыж Ілжэдзмітрыю II, а яго паслу Лазоўскаму і ваярам прапанавалі „перастаць вараваць і вяртацца ў Літву”. Паміж тушынцамі і масквічамі працягнуліся баі. Папярэджваючы перамовы сапежынцаў з маскоўскім баярствам, Самазванец напісаў ліст Я.П. Сапегу з абяцанямі прызнаць сябе васалам Жыгімонта Вазы, выплаціць 200 і 100 000 злотых Рэчы Паспалітай і Уладзіславу Вазе адпаведна. Больш таго, ён паабяцаў за свой кошт заваяваць Лівонію для Рэчы Паспалітай выдаць 15 000 ваяроў для далейшай экспедыцыі Вазаў на Швецыю. Я.П. Сапега склаў на падмурку гэтых умоў кандыцыі, якія войска запрысяжыла пры стварэнні новай канфедэрацыі, у якой паабяцала не пакідаць Самазванца[86].

Яшчэ ў студзені 1607 г. пасол ад баяраў Валконскі патаемна ад

[85] И.О. Тюменцев, *Смута в России*, op. cit., с. 496–498; *Дневники Я.П. Сапеги*, op. cit., c. 204.

[86] *Дневники Я.П. Сапеги…*, op. cit., c. 210; Тюменцев И.О., *Смута в России…*, op. cit., c. 501–503.

В. Шуйскага прапанаваў царскую шапку каралевічу Уладыславу Вазе, а ўлетку 1608 г. прапанова паўтарылася[87]. 22 ліпеня 1610 г . з іншага боку ад Тушына, да Масквы падыйшоў С. Жалкеўскі. Аднак наймітам Я.П. Сапегі залежала, каб царом стаў Ілжэдзмітры. Паміж гетманамі каралеўскага і самазванскага войска пачаліся перамовы. С. Жалкеўскі абвесціў аб нежаданні выбіваць сапежынскае рыцарства з занятых ім гарадоў, пагадзіўся прызнаць васалітэт Самазванца ад караля і папрасіць для войска грошы. Пасля дамовы гетманаў караняжы маглі займаць па правізію землі на поўнач, а сапежынцы на поўдзень ад Масквы.

31 ліпеня жаўнеры маскоўскага гарнізона зрабілі ўдалую вылазку на лагер сапежынцаў. 2 жніўня 1610 г. войскі Ілжэдзмітрыя ІІ ударылі двума калоннамі на Маскву. Галоўнай атакай – на Серпухаўскую браму кіраваў В. Будзіла. Але расійскія ваяводы ў стане С. Жалкеўскага, насуперак ранейшых дамоваў і забароны гетмана, ўдарылі ў спіну сапежынцам і дапамаглі масквічам адкінуць апошніх ад сталіцы. С. Жалкеўскі папрасіў прабачэння і яшчэ раз заверыў, што ня мае ніякіх кепскіх намераў супраць шляхецкай брацї. Аднак трохбаковае супрацьстаянне працягвалася. У бої пад горадам 11 жніўня, у якім масквічы паранілі Януша Скумін Тышкевіча, каралеўскае войска не ўдзельнічала, але стаяла ў баявым шыхце[88]. 17 жніўня 1610 г. масквічы афіцыйна абвесцілі царом Уладзіслава Вазу[89].

Адначасова баяры дамовіліся з Я.П. Сапегам аб перамір'і, а назаўтра, вечарам іншаму войску – С. Жалкеўскага, дазволілі прайсці праз Маскву, каб разагнаць Тушынскі лагер. 26 жніўня 1610 г. С. Жалкеўскі вывеў сваё і маскоўскае войска ў поле перад Тушынам. Я.П. Сапега пашыхтаваўся да бою. Каб пазбегнуць крывапраліцця,

---

[87] Тюменцев И.О., *Смута в России…*, op. cit., с. 283.

[88] *Дневники Я.П. Сапеги…*, op. cit., с. 218; Тюменцев И.О., *Смута в России…*, op. cit., с. 503–504.

[89] *Dyaryusz poselstwa moskiewskiego wysłanego do Warszawy z końcem r. 1611* [w:] Hirschberg A., *Polska a Moskwa w pierwszej połowie weku XVII*, Lwów, 1901. S. 379.

вялікі каронны гетман і гетман войска Самазванца, з’ехаліся перад войскам і пачалі перамовы. Потым да іх пад’ехалі А. Гасеўскі, вялікі маршалак ВКЛ М.К. Дарагастайскі і іншыя палкоўнікі абодвух войскаў. Пагадненне паміж гетманамі было дасягнута. Бітвы не адбылося, а С. Жалкеўскі праз паслоў – літвіна Быхаўца і караняжа Пабядзінскага прапанаваў Ілжэдзмітрыю II прызнаць царскую ўладу Уладзіслава і атрымаць сабе на выбар Самбор ці Гародню. Вечарам жаўнеры азнаёмілі „царэвіча” з вынікам перамоў, але апошні адмовіўся іх разглядаць. Ноччу 27 жніўня кароннае войска пайшло на Нікольскі манастыр, дзе знаходзіўся Самазванец, які ўцек у Калугу. Я.П. Сапега прышоў з двума палкамі на выручку свайму „цару”, але яго сустрэў ужо В. Валеўскі. Гетман-літвін застаўся старэйшым па статусе ў табарах Самазванца і маскоўскія баяры афіцыйна звярнуліся да яго, каб ён не перашкаджаў пераходу расіянаў на бок цара Уладзіслава і баярскага ўраду. 6 верасня 1610 г. адбылася прысяга новаму цару[90]. Восенню Ноўгарад і Арэшак таксама прысягнулі каралевічу[91].

Жадаючы выпіхнуць былых тушынцаў з-пад сталіцы, масквічы працягнулі дыверсіі супраць сапежынцаў. Іх рух атрымаў назву „шышоў”. Ужо 9 верасня вылазка шышоў скончылася сапраўдным боем, у якім сапежынцы забілі каля 200 нападаўшых, а астатніх загналі назад у Маскву[92]. Назаўтра пасля боя, да сапежынцаў вярнуўся пасол пад Смаленск з адмовай караля пацвердзіць абяцанні С. Жалкеўскага. Гнеў жаўнераў удалося перанакіраваць, калі С. Жалкеўскі здолеў выціснуць з разанскіх баяр 10000 рублеў выкупа, каб вывесці сапежынцаў з-пад Масквы і накіраваць на пастой не да іх, а ў Масальск. Перадыслакаваўшыся, сапежынцы заблакавалі рух Самазванца з Калугі.

[90] *Дневники Я.П. Сапеги…*, op. cit., с. 226–228; И.О. Тюменцев, *Смута в России…*, op. cit., с. 507–510.

[91] А.А. Селин, *Смута на Северо-Западе в начале XVI века: очерки из жизни новгородского общества,* СПб, 2017, с.262.

[92] *Дневники Я.П. Сапеги…*, op. cit., с. 231.

Гарнізон Масквы на гэты момант складалі ў асноўным прадстаўнікі Польскага каралеўства, пераможцы з-пад Клушына і атрады маскоўскіх баяр. Жолд ім павінны быў выплочвацца з маскоўскага скарбу, які аднак быў пусты і харчавання таксама не хапала. Жыгімонт Ваза працягваў адмаўляцца браць на дзяржаву чужыя выдаткі, але калі вайсковыя канфедэраты з Інфлянтаў і вэтэраны з Масквы вярнуліся ў межы ВКЛ, пад ціскам соймікаў манарх прызнаў такую магчымасць. У выніку канфлікта, які пачаўся паміж каралём і С. Жалкеўскім, каронны гетман у канцы кастрычніка 1610 г. з'ехаў з Крамля з царскай казной і большай часткай караняжаў. Яшчэ перад ад'ездам па яго згодзе з баярамі, „старастам" Масквы і кіраўніком 5000 найманага гарнізона стаў А. Гасеўскі.

Я.П. Сапега зноў стаў самым аўтарытэтным лідарам замежнага рыцарства. Ён перабазаваўся на Севершчыну ў пачатку кастрычніка 1610 г. займаўся зборам і падвозам правізіі для залогі Масквы. Са згоды Сямібаяршчыны ім і іншым ротам з Рэчы Паспалітай былі распісаны прыстаўствы на тэрыторыі Маскоўскай дзяржавы. Бароўскі ўезд дастаўся Э. Стравінскаму, Суздаль і Кастрама – роце Я. Парыцкага[93], у якой служыў літвін Самуэль Маскевіч. У снежні 1610 г. Жыгімонт Ваза нарэшце пагадзіўся прыняць сапежынцаў на службу Рэчы Паспалітай і паабяцаў разлічыцца па запазычанасцях Самазванца[94].

На канец восені ў Калузе ў „цара Дзмітрыі" сабралося 3000 расіян, 500 татар і 1000 наймітаў. Новым гетманам у яго стаў В. Валеўскі. Я. Кернажыцкі быў накіраваны ў паслом у Астрахань. У пачатку студзеня 1611 г. татары Пятра Урусава разбілі роту сапежынцаў Чаплінскага. 10 студзеня 1611 г. падчас балю ў гонар гэтай перамогі П. Урусаў забіў Самазванца. Сапежынцы і казакі пайшлі ў наступ на раней верныя Самазванцу гарадкі Севершчыны.

---

93 S. Uruski, *Rodzina. Herbarz szlachty polskiej,* t. XIV, Warszawa 1917, s. 267.

94 И.О. Тюменцев, *Смута в России...*, op. cit., с 506–517.

Прыналежнасць войсковых фармаванняў да пэўнай палітычнай структуры, калі не ўваходзіць у аналіз самасвядомасці кожнага ваяра, вызначаецца паводле таго, якая дзяржава наймала жаўнера на службу, чый афіцэрскі корпус кіраваў аддзеламі, хто забяспечваў армію на полі боя, чый скарб і чыноўнікі ажыццявілі фінальны разлік з жаўнерамі за службу. Фармальна дабраахвотнікі на службе Самазванца былі наймітамі, а значыць іх ідэнтычнасць не павінна была граць ролі. Аднак, падзел на „караняжаў" і „літву" меў месца і паўплываў на ход падзей. Паводле дакументаў эпохі ў этнічным плане палкі ўдзельнікаў Смуты складала мяшанка з „літвы", „палякаў", „нізоўцаў", „масквы", „немцаў", татараў і казакоў з розных рэгіёнаў. Роты лёгкай кавалерыі – лісоўчыкаў і казакоў былі найбольш стракатымі, але „капійнікаў" – гусарыю і пяцігорцаў у большасці выпадкаў складалі прадстаўнікі шляхты Рэчы Паспалітай. Немагчыма высвятліць імёны большасці шэраговых удзельнікаў рот, але ў крыніцах ёсць узгадкі прозвішчаў ротмістраў і таварышчаў. Шляхту часта ставілі кіраваць ротамі іншых народаў і „прасталюдзінаў", як, напрыклад, адбылося з А. Лісоўскім, Я.Кернажыцкім і, мяркуючы па разліку, з А. Гасеўскім і В. Будзілам. Грамадзянства асобных ваяроў – „абывацельства" вызначалася паходжаннем бацькоў і спадчыннай маёмасцю ў пэўным павеце. Шляхецкія карпарацыі ВКЛ і Кароны ахоўвалі асобнасць сваіх структур і манаполію сваіх прадстаўнікоў на размеркаванне рэсурсаў у сваей частцы Рэчы Паспалітай. Пры гэтым абодва войскі Рэчы Паспалітай: ВКЛ і Польскага Каралеўства былі не нацыянальнымі, а прафесійным – караняжы найmaліся і служылі ў найманых ротах арміі ВКЛ, а літвіны – у каронных. Удзел у авантуры Самазванца быў прыватнай інцыятавай за якую заплацілі абедзьве дзяржаўныя структуры Рэчы Паспалітай, падзяліўшы выдаткі паміж сабой.

Падчас баявых дзеянняў у Інфлянтах, а потым у Маскве за 1600–1618 г. жаўнеры і ротмістры змянялі роты, камандзіраў і паднача-

ленне. Найбольшая мешаніна ўтварылася ў 1611 – 1613 г., калі ўдзельнікі баявых дзеянняў у Інфлянтах 1605 – 1611 г., Дзмітрыядзе 1606 – 1611 г. і дзяржаўныя войскі са Смаленска і Масквы 1609–1612 г. вярнуліся па ўзнагароду ўсяго заслужанага ў Рэч Паспалітую. Роты з ВКЛ выстаўлялі рахункі ў першую чаргу сваёй дзяржаве, размяшчаліся на яе землях, але манарх і вальны сойм быў агульны. Паколькі скарб ВКЛ быў хранічна пусты і гадамі не выплочваў ім заробку, жаўнеры ВКЛ стваралі канфедэрацыі, аб'ядноўваліся з каранямжамі і з 1607 г. пачалі выбіваць грошы за сваю службу з каралеўскіх уладанняў і скарба не толькі ВКЛ, але і ў Польшчы. Каб справядліва ўлічыць заробак сваіх суграмадзян і ацаніць страты абодвух шляхецкіх карпарацый ад пастояў канфедэратаў вальны сойм 1613 г. прызначыў змешаныя каронна-літоўскія камісіі па разліку з імі[95]. Калі літвіны атрымлівалі разлік у складзе каронных рот, літоўскі скарб павінны быў падвезці грошы ці гасіць выдаткі польскаму і наадварот.

Пасля завязвання войскам „сталічнай"[96] канфедэрацыі на Крамлі пад маршалкоўствам Юзэфа Цэклінскага і ад'езду ў лютым 1612 г. з Масквы каронных рот, разам з імі ў Львоў выправіліся палкі А. Збароўскага, А. Гасеўскага, Я. Парыцкага. Аднак большасць „сапежынскіх" жаўнераў ВКЛ заняла сталовыя эканоміі ВКЛ з цэнтрам у Берасці і вяла перамовы ажно да поўнага разліку з імі 1 лістапада 1613 г.[97] з ураднікамі ВКЛ[98]. У выніку разлік атрымалі за службу ў Інфлянтах 1605-1609 г., войску Самазванца ІІ і ў смаленска-маскоўскіх кампаніях Жыгімонта Вазы 1609 – 1612 гг. гусарскія роты: дзве „белая" і „чорная" Я.П. Сапегі (з Кароны ім заплацілі 695 і 849/15+100 з ВКЛ 48585 і 46340/15 злотых за кожную адпаведна), Сумы і Глухоўскага (64 злотых з Кароны і 35890 злотых з ВКЛ),

[95] *Volumina legum*, T. III, St. Petersburg 1860, s. 81–82.

[96] LMAVB, f. 17–178, p. 5–6.

[97] BCzart, sign, 2245, №10.

[98] A. Filipczak-Kocur, *Skarbowość Rzeczy Pospolitej 1587–1648. Projekty – ustawy – realizacja,* Warszawa 2006, s. 289.

Тышкевічаў (55+11670/29 з Кароны і 14474/1 злотых з ВКЛ), Чарноцкага (Карона – 336, з ВКЛ – 38844 злотых), Падгарадынскага (Карона – 504/20 ВКЛ-21685/10 злотых), роту Пакірскага цалкам аплаціла ВКЛ, а Дэмбінскага – цалкам Карона. З Кароны большасць грошай заплацілі за роту Каменскага (784+55376/10 і 369/10 з ВКЛ) і большасць выдалі за роту В. Будзілы (35743/25 з Кароны і 2676/5 з ВКЛ), Кербеца (з Кароны – 18822 і 5318 злотых з ВКЛ), Сямашкі (Карона – 29266 і 1214 злотых ВКЛ) а так сама за Бадзяноўскага, Бялінскага, Левікоўскага. Прычым, паколькі шмат мужоў патрапіла ў палон ці загінула, іх заслужанае атрымалі жонкі ротмістраў: Сумы і Глухоўскага, Тышкевіча, Кербеца, Будзілы, Сямашкі. На гусарскія роты скарб ВКЛ выдаў 513825 злотых. З ВКЛ паходзілі роты пяцігорцаў: Хруслінскага, Стравінскага, Іваноўскага, Бернацкага, Стогнева, Бедрыцкага, жонкам Стэцкевіча, Скалка, Белазора. З іх толькі Семіхоўскі атрымаў узнагароджанне з Кароны. Разам за пяцігорцаў выходзіла 244605 зл. Сярод казакоў з Кароны паходзілі роты Дзербіцкага і жонкі нейкага Марціна, а з ВКЛ: Токарскага, Стагнева, Чаплінскага, Германовіча (атрымала жонка), Вайцэхоўскага. Казацкія роты ўзялі са скарбу ВКЛ агулам 158900 зл. Палку А. Лісоўскага выдалі яшчэ 15000 зл.

Выдаткі былі астранамічныя, збіраліся яны павольна і галоўны з'езд шляхты ВКЛ 9 лістапада 1613 г. прызначыў на аплату інфлянцкім і Берасцейскім канфедэратам усе свае падаткі і дабраахвотныя складкі[99]. Агулам ВКЛ выдаткавала на маскоўскую і інфлянцкую вайну 1220000 злотых, у той час, як Карона выдала 4194783 злотых. Паводле справаздачы падскарбія ВКЛ Яраша Валовіча сойму 1613 г. скарб ВКЛ, выплаціў канфедэратам 833252, 25 злотых і акрамя таго, скарбны ВКЛ Мікалай Бральніцкі прывез сапежынцам у Берасце 541000 і 1715,20 злотых[100]. Па выніку разлікаў 1612–1614 г. Берасцейскія канфедэраты атрымалі – 541716,

---

[99] *Akta zjazdów stanów Wielkiego Księstwa Litewskiego*, t. 2. Warszawa 2009, s. 179–183.

[100] РНБ, ф. 971, воп. 2. Аўт.63/2. арк. 39.

Сталічныя – 10741, Смаленскія – 22923, Інфлянцкія – 180535 зл. адпаведна, акрамя таго, кампенсацыю за службу ў 13525 злотых выдалі А. Гасеўскаму[101]. Апошнімі з удзельнікаў Дзмітрыяд у сакавіку 1614 г. разлічыліся роты Юрыя Збароўскага, Язэпа Корсака, Габрыэля Тупальскага і Паўла Руцкага. Яны прынялі грошы разам з інфлянцкімі канфедэратамі 1611–1612 г. у Менску[102], што сведчыць аб іх выхадзе пасля вайны ў Маскве на гарнізоную службу ў Інфлянты.

Такім чынам удзел шляхты ВКЛ – „літвы" у падзеях другой Дзмітрыяды відавочны. Шляхта, маяшчане і прафесійныя жаўнеры інфлянцкай арміі ВКЛ бралі ўдзел у выправе Ілжэдзмітрыя II ад самага яго пачатку і да канца. З'яўленне і знікненне кандыдатаў на Самазванца ў Віцебску і Сандаміры, як і фінальнае выпраўленне „шклоўскага бадзягі" з Прапойска, як і карэспандэнцыя ўраднікаў ВКЛ вакол гэтых падзей, можа сведчыць аб удзеле беларускай шляхты ў падрыхтоўцы авантуры Ілжэдзмітрыя II на прыватным узроўні. Разам з тым, наяўныя крыніцы не дазваляюць сцвярджаць напэўна аб інспірацыі руху спецслужбамі ВКЛ. У войску Самазванца найманыя роты былі адносна роўныя па колькасці. Яны захоўвалі свае камандаванне і характэрны для Рэчы Папалітай падзел на каронную і літоўскую часткі. Прыход у Тушынскі лагер брацлаўскай і кіеўскай шляхты з начале Р. Ружынскім і запарожскіх казакоў пахіснулі ўладу у бок караняжаў, але падыход войска Тышкевічаў і А. Лісоўскага ўраўняла палітычныя пазіцыі прадстаўнікоў дзьвух частак Рэчы Паспалітай. Калі ж да войска Самазванца далучыўся славуты ротмістр з інфлянцкага войска ВКЛ Я.П. Сапега і шэраг яго баявых таварышаў, адбыўся кампраміс, паводле якога Р. Ружынскі стаў гетманам на поўдзень, а Я.П. Сапега на поўнач ад Масквы. Менавіта на долю аддзелаў, якімі кіравалі грамадзяне

---

[101] A. Filipczak-Kocur, *Skarbowość Rzeczy Pospolitej 1587–1648. Projekty – ustawy – realizacja,* Warszawa 2006, c. 291.

[102] Г.М. Сагановіч, *ВКЛ і вайсковыя канфедэрацыі 1612–1614 гг.* „Беларускі гістарычны агляд', 2008. Т. 15, с. 116.

ВКЛ, прыйшліся асноўныя баявыя дзеянні 1608–1610 г. супраць апалчэнцаў Шуйскіх і войскаў Швецыі, аб чым сведчыць не толькі пералік дзеючых асоб, але і разлік з ротамі „сапежынцаў" і іншых праз структуры ВКЛ у 1611–1614 г.

## Бібліяграфія

### Архіўныя крыніцы

Archiwum państwowe na Wawelu (Archiwum Narodowe w Krakowie), „Archiwum Sanguszków Sławuckie", Sygn. 51.

Biblioteka książąt Czartoryjskich, Sign. 102, №117; Sign, 103, №250; Sign, 104, №216; Sign, 2073, №69 (295); Sign, 2245, №10.

Biblioteka Naukowa Polskiej Akademii Nauk i Polskiej Akademii Umiejętności, Sygn. 363, №23.

Lietuvos Mokslu Akademijos Vrublevskiu Biblioteka, f. 9–431, p.143; F.17–178, p.5–6

Natsyyanalny Gistarychny Arkhiu Belarusi [Нацыянальны Гістарычны Архіў Беларусі, КМФ 18, Метрыка Літоўская, спр. 85, воп. 1, арк. 429; спр. 289, воп. 1, арк. 188, 320, 338, 375; спр. 293, воп. 1, арк. 66 аб.–67. 189, 220; спр. 596. арк.1–14].

Rasiyskaya natsyyanalnaya bibliyateka u Sankt Petsiarburgu [Расійская Нацыянальная бібліятэка ў Санкт–Пецярбургу], ф. 971. воп. 2, „Аўтографы П.П. Дуброўскага", Аўт.63/2, арк.39, арк. 22.

### Літаратура

*Akta zjazdów stanów Wielkiego Księstwa Litewskiego*, red. H. Lulewicz. T. 2: Okresy panowań królów elekcyjnych, Warszawa 2009.

Âkubaŭ V.U., *Peršyâ kanfedèracyì vojska Vâlìkaga Knâstva Lìtoŭskaga ììh uplyŭ na sìtuacyû ŭ Vâlìkìm Knâstva Lìtoŭskaga ì ìh uplyŭ na sìtuacyû ŭ Vâlìkìm Knâstve Lìtoŭskìm u 1604–1608 gadah* „Vesnìk Polackaga dzâržaŭnaga unìversìtèta". Seryâ A. Gumanìtarnyânavukì. Nr. 7. 2008, s. 34–44 [Якубаў В.У., *Першыя канфедэрацыі войска Вялікага Княства Літоўскага і іх уплыў на сітуацыю ў Вялікім Княстве Літоўскім у 1604–1608 гадах* „Веснік Полацкага дзяржаўнага універсітэта". Серыя А. Гуманітарныя навукі. Nr. 7. 2008, с. 34–44].

*Barkulabaŭskaâ hronìka* [y:] *Belaruskìâ letapìsy ì hronìkì,* red. Arloŭ U.,Mìnsk 1997 *[Баркулабаўская хроніка* [у:] *Беларускія летапісы і хронікі*, ред. Арлоў У., Мінск 1997].

Bohun T., *Moskwa 1612,* Warszawa 2005.

*Dnevniki Âna Petra Sapegi (1608–1611)* [u:] *Pamâtniki Istorii Vostočnoj Evropy. Istočniki XV–XVII v.* T. IX Gralâ, I., Florâb.N., Èskin, Û.M., Tûmencev I. Moskva 2012 *[Дневники Яна Петра Сапеги (1608–1611)* [у:] Памятники Истории Восточной Европы. Источники XV–XVII в. *T. IX* Граля, И., Флоря Б.Н., Эскин, Ю.М., Тюменцев И. Москва 2012].

Dyaryu*sz poselstwa moskiewskiego wysłanego do Warszawy z końcem r.1611* [w:] Hirschberg A., *Polska a Moskwa w pierwszej połowie weku XVII*, Lwów, 1901.

*Dyaryusz Waclawa Dyamentowskiego (1605 – 1609)* [w:] Hirschberg A., *Polska a Moskwa w pierwszej połowie weku XVII*, Lwów, 1901.

Dzemìdovìč A.V., V*âlìkae Knâstva Lìtoŭskae ŭ Adnosìnahrèčy Paspalìtajz Rasìej ì Švecyâj u peršaj trècì XVII st.,* Mìnsk 2021 [Дзэмідовіч А.В., *Вялікае Княства Літоўскае ў адносінахРэчы Паспалітай з Расіей і Швецыяй у першай трэці XVII ст.*, Мінск 2021].

Filipczak-Kocur A., *Skarb Litewski za pierwszych dwu Wazów 1587–1648,* Wrocław 1994.

Filipczak-Kocur A., *Skarbowość Rzeczy Pospolitej 1587 – 1648.Projekty – ustawy – realizacja,* Warszawa 2006.

*Historia wojny moskiewskiej przez Mikołaja Scibora z Marchocic Marchockiego*, Poznań 1841.

Niesiecki K., *Herbarz polski,* t. III, Lipsk 1839.

Niesiecki K., *Herbarz polsk*i, t. IX, Lipsk 1842.

Niesiecki K., *Herbarz polsk*i, t. T. IV, Lipsk 1839.

Niesiecki K., *Herbarz polsk*i, t. VI, Lipsk 1841.

*Pamâtniki smutnogo vremeni.Tušinskij vor: ličnost', okruženie, vremâ. Dokumenty i materialy* [у:] *Trudy istoričeskogo fakul'teta MGU*. Seriâ 1. Nr. 10. Istoričeskie istočniki. Moskva 2001 *[Памятники смутного времени. Тушинский вор: личность, окружение, время. Документы и материалы* [w:] Труды исторического факультета МГУ. Серия 1. Nr. 10. *Исторические источники*, Москва 2001].

Przepiórka A.G., *Od Staroduba do Moskwy. Działania wojsk Dymitra II Smozwańca 1607 – 1608*, Zabrze 2007.

Saganovìč G.M., *VKL ì vajskovyâ kanfedèracyì 1612–1614 gg.,* „Belaruskì gìstaryčny aglâd". T. 15 (28–29). 2008, s.100–123 [Сагановіч Г.М., *ВКЛ і вайсковыя канфедэрацыі 1612–1614 гг.,* „Беларускі гістарычны агляд". Т. 15 (28–29). 2008, с.100–123].

Selin A.A., *Smuta na Severo-Zapade v načale XVI veka: očerki iz žizninovgorodskogo obŝestva,* SPb 2017 [Селин А.А., *Смута на Северо-Западе в начале XVI века: очерки из жизни новгородского общества*, СПб 2017].

Sobieski W., *Żółkiewski na Kremlu*, Warszawa 1920.
*Szwedzkie wojny 1611–1632*, t. I/2, Oświęcim 2015.
Tûmencev I.O., *Oborona Troice – Sergieva monastyrâ 1608 – 1610 gg.,* Moskva 2007 [Тюменцев И.О., *Оборона Троице – Сергиева монастыря 1608 – 1610 гг.*, Москва 2007].
Tûmencev I.O., *Smuta v Rossii v načale XVIII st.: dviženie Lžedmitriâ,* Volgograd 1999 [Тюменцев И.О., *Смута в России в начале XVIII ст.: движение Лжедмитрия*, Волгоград 1999].
Uruski S., *Rodzina. Herbarz szlachty polskiej*, t. IV, Warszawa 1909.
Uruski S., *Rodzina.Herbarz szlachty polskiej*, t. I, Warszawa 1904.
Uruski S., *Rodzina.Herbarz szlachty polskiej*, t. V, Warszawa 1908
Uruski S., *Rodzina.Herbarz szlachty polskiej*, t. II, Warszawa 1905.
Uruski S., *Rodzina.Herbarz szlachty polskiej*, t. III, Warszawa 1906.
Uruski S., *Rodzina.Herbarz szlachty polskiej*, t. XI, Warszawa 1914.
Uruski S., *Rodzina.Herbarz szlachty polskiej*, t. XIV, Warszawa 1917.
*Volumina constiutionum*. Рэд.S. Grodziski, t. II, vol. 1, Warszawa 2005.
*Volumina legum.* Рэд. J. Ohryzka. T. III, St. Petersburg 1860.
Żojdź K., *Wszyscy ludzie króla: Zygmunt III Waza i jego stronnicy w Wielkim Księstwie Litewskim w pierwszych dekadach XVII wieku*, Toruń 2019.

## Participation of the GDL citizens in the army of falshe Dmitry II in 1608–1610

The main goal of the article is to find and highlight the participation of representatives of Grand Duchy of Lithuania in the movement of False Dmitriy II during the Russian Thames of Troubles. The participation of representatives of the Belarusian lands of the GDL in the mercenary army of False Dmitri II and their separate command from representatives of the Ukrainian magnatery of Polish Crown, which was in charge in the Tushino camp of the Impostor, was proven. The First and Second Dmitry was officially ignored by the governing circles of the GDL, and the king Sigismund Vasa forbade the participation of the citizens and nobles of the border lands in attacking the moskovites on both sides of the border. at first, the district border nobility joined the impostor – J. Budzilla, J. Kernazycki, M. Wilamowski and the criminals of A. Lisowsky, and only after the end of the rokash in the GDL, on the summer of 1608, captains, veterans from the Grand Duchy Inflant army: J.P. Sapega, J. Tyszkewicz, A. Mlocky, E. Strawinski and others become commanders of regiments in the service of False Dmitry II. In contrast to the Ukrainian lands of the Polish kingdom, the magnatery of the Lithuanian Commonwealth,

except for the Tyszkewicz, did not support False Dmitri. There is currently no evidence of a behaviour – determining connection J.P. Sapega with L. Sapega and Sigismund Vasa. J.P. Sapieha became the hetman of north grope of armies of False Dmitry II. He and his captains of hired forces from the GDL origin performed the most important combat tasks in 1609–1610, occupied the Russian North tried to prevent the march of M. Skopin Shuisky and the Swedes to Moscow in the fall of 1609. After the beginning of the interstate war 1609–1618, the escape of False Dmitry II and the oath of Moscow to Prince Wladislaw, the mercenaries from the GDL joined the state forces, by their own good will.
K e y w o r d s: Grand Duchy of Lithuania, False Dmitry II, mercenary troops, volunteers magnates